

БАЛЕРЫНА, УЗНАГАРОДЖАНАЯ ІМПЕРАТАРАМ **10**

НОВЫЯ СПАБОРНІЦТВЫ Ў ФРЫСТАЙЛЕ **13**




Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

26 ЛЮТАГА 2019 г. АЎТОРАК № 38 (28905)


# ЛЕБЯДЗІНЫ «ПЕРАПІС»





У моцныя маразы мінулых зім на Новалукомскае вадасховішча Чашніцкага раёна зляталася болей за чатырыста асобін лебедзяў-шыпуноў. Сёлета зіма для птушыных была лагодная, таму грацыёзных і надзіва даверлівых белакрылых птушак каля азёрнага берага было ў два разы меней. Пра гэта ведае **грамадскі арнітолаг жыхар горада энергетыкаў Віталь КАШЧЭЕЎ**. Кожную зіму, апантаны захаваннем папуляцыі розных відаў птушак, ён назірае за паводзінамі крылатых, вядзе іх улік, дапамагае навукоўцам-арнітолагам кальцаваць дарослых птушак. Сёлета паміж працоўнымі вахтамі (ён працуе машыністам-абходчыкам турбіннага цэха электрастанцыі) Віталь паспеў акальцаваць болей за два дзясяткі лебедзяў-шыпуноў. Ён і цяпер, калі возера пасля працяглай адлігі ачысцілася ад лёду і птушкі пачынаюць мігрыраваць, працягвае сваю місію «перапісчыка»: «узнагародзіў» трохгадовага лебедзя *(на фота)* адмысловым «лебядзіным» кальцом пад нумарам АА0906.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Аляксандр ТУРЧЫН, першы намеснік прэм'ер-міністра:**

*«Для прыросту ВУП сёлета на 4 працэнты ў нас ёсць рэзервы, і немалыя. Чатыры працэнты — гэта якраз крыху вышэй за тэмпы росту сусветнага ВУП, але мэта — дасягальная. Першы крок для павышэння эфектыўнасці эканомікі — нармальнае карпаратыўнае кіраванне. Мы ўнеслі ў Адміністрацыю Прэзідэнта праект указа па шэрагу прадпрыемстваў, наглядальны савет якіх павінны ўзначаліць найвышэйшыя службовыя асобы, плюс топ-100 акцыянерных таварыстваў нашай краіны, на якіх мы выбудуем нармальную эфектыўную сістэму карпаратыўнага кіравання. Калі б мы дасягнулі вынікаў па гэтых прадпрыемствах-лідарах, то ў прынцыпе 150 мільярдаў ВУП мы б мелі».*

## КОРАТКА

- **Сярэдні заробак работнікаў у студзені гэтага года склаў Br981,6.**
- Больш за 100 твораў скульптуры, графікі і ювелірнага мастацтва, створаных Сальвадорам Далі, прадстаўяць 16 сакавіка ў Нацыянальным мастацкім музеі.



- **Спецыялізаваная зала для заняткаў фехтаваннем адкрылася ўчора ў Гродне.**
- Найлепшым фільмам «Оскара-2019» стала «Зялёная кніга».
- **Сямейная пара з Баранавічаў не выплаціла ў бюджэт больш за Br120 тыс. падаткаў ад даходу за мяжой.**


ISSN 1990 - 763X


Шануй сваё

# «ГАВАРЫ СА МНОЙ ПА-БЕЛАРУСКУ»

**Як у Квасоўскай сярэдняй школе Гродзенскага раёна фарміруецца культурнае і этнічнае асяроддзе**

**І гэта не выклікае цяжкасці. Бо беларуская мова гучыць тут штодзённа, амаль на кожным уроку. Але не толькі. Жыццё школы таксама падпарадкавана захаванню сваёй спадчыны. І так адбываецца роўна 80 гадоў. Менавіта столькі мінула з тае пары, як у Квасоўцы пачала дзейнічаць беларускамоўная школа.**


СТАР. 5





Фота Мікалая ЛАПІНА.

Сітуацыя

# ПРАД'ЯВІЦЕ ПАШПАРТ!

## Якія махінацыі махляры могуць здзейсніць са страчаным дакументам

**Чаму трэба адразу ж паспяшацца ў міліцыю, калі вы згубілі пашпарт або яго ў вас скралі? Чым пагражае сітуацыя, калі вашы даныя трапілі ў чужыя рукі?**

**У некаторых выпадках гэта можа каштаваць чалавеку вельмі дорага, ва ўсіх сэнсах гэтага слова. Аб самых папулярных спосабах выкарыстання чужых пашпартных даных махлярамі «Звяздзе» расказала адвакат спецыялізаванай юрыдычнай кансультацыі № 1 па прававым абслугоўванні суб'ектаў гаспадарання Мінска Кацярына ЛЯЎЧУК.**

### Чым можа быць небяспечна залішняя даверлівасць

Пры пэўных абставінах з дапамогай чужых даных можна аформіць крэдыт у банку, кажа Кацярына Ляўчук. Гэта найбольш часты від махлярства са скрадзеным пашпартам. Але яно становіцца магчымым толькі дзякуючы сумесным намаганням злачынцаў і несумленнага ці няўважлівага супрацоўніка банка. Першыя бяруць крэдыт, пагашаць які разам з працэнтамі і штрафамі даводзіцца ўладальніку пашпарта. Ён потым вымушаны даказваць сваю невінаватасць, праходзячы праз мноства судовых цяжбаў, выкарыстоўваючы паказанні сведак і г. д. Як правіла, такія суды добрасумленны грамадзянін у рэшце рэшт выйграе, але на іх патрабуецца выдаткаваць нямала часу, намаганняў і нерваў.


СТАР. 4

# НЕ ПРОСТА ПАРТНЁРЫ — СЯБРЫ

## Беларусь будзе трымацца пазітыўнага парадку дня ў адносінах з Кыргызстанам

**Такое меркаванне выказаў Аляксандр Лукашэнка падчас сустрэчы з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Кыргызскай Рэспублікі ў Рэспубліцы Беларусь Кубанычбекам Амураліевым.**

Кіраўнік дзяржавы назваў падобныя сустрэчы — з пасламі дружалюбных для Беларусі краін — традыцыйнымі. На іх у тым ліку абмяркоўваюцца праблемы ў двухбаковых адносінах.

«Перш за ўсё хачу адзначыць вельмі добрую дынаміку развіцця нашых адносін. Вы ніколькі не павінны сумнявацца пры ўсякіх нюансах: Беларусь заўсёды была і будзе для вас надзейным не проста партнёрам, а сябрам, — падкрэсліў беларускі лідар. — Я вельмі разлічваю, што аналагічную палітыку будзе праводзіць і кіраўніцтва Кыргызскай Рэспублікі. І мы, як і ў былыя часы, добрыя часы, калі жылі ў адной дзяржаве, мы заўсёды з любоўю і паразуменнем ставіліся да кыргызскага народа. Гэта вельмі падобныя на нас людзі».

Аснова нашага падабенства, на яго думку, заключаецца ў тым, што кыргызы — гэта працавітыя і міралюбныя людзі, якія шануюць сямейны ачаг. Прэзідэнт адзначыў, што шмат разоў бываў у Бішкеку і іншых населеных пунктах гэтай дзяржавы, дзе і вывяў падабенства народаў.

«Мы будзем прытрымлівацца добрага парадку дня ў адносінах паміж Беларуссю і Кыргызстанам. І любыя вашы просьбы, прапановы, заўвагі неадкладна будуць разгледжаны ва ўрадзе, мною, і мы заўсёды адрэагуем. Я таксама хачу скарыстацца магчымасцю і папрасіць вас, каб вы перадалі самыя добрыя, цёплыя пажаданні майму добраму сябру, Прэзідэнту Кыргызстана. Гэта вельмі прыстойны чалавек. Вось бывае ж так, што ў патрэбны час і ў патрэбным месцы ў самыя складаныя часы Гасподзь пасылае народу таго чалавека, які вельмі патрэбны гэтаму народу», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Ён выказаў надзею, што калі народ Кыргызстана згуртуецца вакол гэтага чалавека, то краіна зможа шмат чаго дасягнуць. Кіраўнік дзяржавы дадаў, што Беларусь гатова падтрымаць Кыргызстан у сілу сваіх магчымасцяў, падставіць плячо.

«Памятайце, што тут у вас сябры», — сказаў беларускі лідар.

У адказ Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Кыргызстана ў Беларусі звярнуў увагу, што ідэю традыцыйных сустрэч пасloў з кіраўніком дзяржавы вельмі добра прынялі многія кіраўнікі дыпламатычных місій у Беларусі. «Не толькі я, але і мае калегі ўдзячныя (за такую магчымасць. — **«Зв.»**)», — сказаў ён.

Па выніках сустрэчы ў кіраўніка дзяржавы Кубанычбек Амураліеў пагутарыў з журналістамі.

Ён адзначыў, што з Аляксандрам Лукашэнкам удалося абмеркаваць дынаміку развіцця адносін паміж краінамі як у двухбаковым, так і ў шматбаковым фармаце ў рамках розных арганізацый.

«Вядома, гандлёвае сальда адмоўнае (для Кыргызстана. — **«Зв.»**). Беларусь экспартуе 95 працэнтаў, імпартуе — 5 працэнтаў, але гэта не значыць, што гэта такі аднабаковы гандаль, гэта проста ўзаемавыгадна», — падкрэсліў пасол. Ён звярнуў увагу на якасць беларускай прадукцыі і яе запатрабаванасць на кыргызскім рынку.

Таксама на сустрэчы разважалі аб культурна-гуманітарным супрацоўніцтве і праектах, мерапрыемствах у гэтай сферы.

Пасол нагадаў, што ў чэрвені бягучага года пройдзе саміт лідараў краін Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва, дзе сустрэнуцца прэзідэнты Беларусі і Кыргызстана. «Ну, і не за гарамі, хутка адбудзецца афіцыйны абмен візітамі, — расказаў ён. — Калі? Над гэтым працуем, можна ў канцы года чакаць».

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.**

**У 2018 годзе тавараабарот паміж краінамі склаў 130,9 млн долараў (100,7 % да ўзроўню 2017 года), экспарт — 120,3 млн долараў, імпарт — 10,6 млн долараў (160,4 %). Сальда дадатнае ў памеры 109,7 млн долараў.**

**Экспарт беларускіх паслуг у 2018 годзе склаў 4,4 млн долараў, імпарт — 0,8 млн долараў (124,8 %). Сальда дадатнае — 3,6 млн долараў.**

# СУД І СПРАВА

**Учора Прэзідэнт сустрэўся са старшынёй Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь Валянцінам Сукалам.**

Напярэдадні анансаванай на мінулым тыдні нарады з праваахоўнікамі беларускі лідар папрасіў старшыню Вярхоўнага Суда даць сваю ацэнку функцыянаванню беларускай праваахоўнай сістэмы і асабліва Следчага камітэта. «У вас, як у люстэрку, гэта ўсё адлюстроўваецца, вы бачыце тэндэнцыі», — адзначыў ён.

Таксама Прэзідэнт даручыў Валянціну Сукалу падрыхтаваць выступленне для гэтай нарады і выказаць пазіцыю судзейскага корпуса ў цэлым, каб былі дадзены адпаведныя ацэнкі і адзначана, што трэба будзе зрабіць у перспектыве. «Я вас вельмі прасіў бы, вы паглядзіце ўважліва на судзейскі корпус. Мы апошнім часам фіксуем занадта шмат парушэнняў закона самімі суддзямі. Я разумею, што ў сям'і не без выradka, розныя людзі бываюць, але тым не менш, калі атрымліваеш інфармацыю аб супрацьпраўнай дзейнасці саміх суддзяў — ну гэта ўжо ні ў якія вароты не лезе, таму трэба нейкім чынам акуратна папярэдзіць, яшчэ раз ім нагадаць, што перад законам усе роўныя. І судзейскі корпус, і выканаўчая ўлада, і заканадаўцы — тут адступленняў быць не можа», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Ён таксама звярнуў увагу, што часта гаворыць аб справядлівасці — і каму, як не судзейскаму корпусу, рэалізоўваць гэтую ўстаноўку і адказваць на запыт насельніцтва. «Людзі нашы асаблівыя, яны вельмі адчувальныя да гэтага, — сказаў кіраўнік дзяржавы. — Таму судзейскі корпус — лакмусавая паперка. Мы пра гэта яшчэ будзем казаць пры адкрыцці новага будынка (Вярхоўнага суда. — **«Зв.»**), калі мы там збяром судзейскі корпус».

Акрамя таго, Аляксандр Лукашэнка пацікавіўся шэрагам пытанняў, якія знаходзяцца на кантролі ў Прэзідэнта, асабліва шэрагам крымінальных спраў. Таксама беларускі лідар заклікаў Валянціна Сукалу выказаць уласнае меркаванне з нагоды гучных спраў апошняга часу.

У адказ старшыня Вярхоўнага Суда адзначыў, што калі казаць пра судовую сістэму ў цэлым, то яна ў мінулым годзе вывучалася спецыяльнай камісіяй, створанай па распараджэнні кіраўніка дзяржавы. Такім чынам, пасля рэфармавання аб'яднаная судовая сістэма здольная выконваць пастаўленыя перад ёй задачы, упэўнены Валянцін Сукала, а некаторая аптымізацыя судовых нагрузак дазваляе рухацца наперад, паляпшаць якасць і эфектыўнасць правасуддзя.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.**

### ❍ У тэму

## Прэзідэнт даручыў распрацаваць законапраект аб амністыі

Гэта зроблена ў сувязі з 75-годдзем вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, расказаў па выніках нарады Валянцін Сукала.

«Апошняя амністыя ў нас была чатыры гады таму, і кіраўнік дзяржавы сёння даручыў МУС, Вярхоўнаму Суду пачаць такую распрацоўку праекта закона аб амністыі, які, напэўна, будзе прыняты да гэтай юбілейнай даты, — адзначыў ён. — Улічваючы, што гэта юбілейная дата, амністыя можа быць шырэйшай, чым звычайна, і можа закрануць асоб, якія ўжо адбываюць пакаранне, у плане скарачэння тэрмінаў пазбаўлення волі».

Валянцін Сукала праінфармаваў, што практычна завершаны ўсе будаўніча-мантажныя пусканаладачныя работы ў будынку Вярхоўнага Суда. На дадзены момант ідзе апрабацыя камп'ютарных сістэм, апаратна-праграмнага комплексу. 10 сакавіка рабочая камісія канчаткова вырашыць пытанне аб гатоўнасці будынка. «Плануецца, што ў пачатку красавіка будзе ўрачыстае адкрыццё гэтага будынка з удзелам кіраўніка дзяржавы», — адзначыў старшыня Вярхоўнага Суда.

Адначасова з адкрыццём будынка плануецца вялікая нарада з кіруючым складам судзейскага корпуса краіны, а таксама сілавых, праваахоўных органаў. Планаваная колькасць удзельнікаў — 300—350 чалавек.

Старшыня Вярхоўнага Суда адзначыў, што вялікая сустрэча стане адкрытай размовай аб праблемах і недаглядах, а таксама рэальных магчымасцях для паляпшэння якасці, аператыўнасці работы судовай сістэмы.

## Рэцыдывы злачыннасці

«38 працэнтаў злачынстваў здзяйсняюць раней судзімыя людзі. Гэта сведчыць пра наяўнасць праблем у рабоце крымінальна-выканаўчай сістэмы, эфектыўнасці выкананых пакаранняў. Калі мы кажам пра праблему рэцыдыўнай злачыннасці, трэба казаць, што ў крымінальна-выканаўчая сістэма ў чымсьці дае збой. Можа быць, нават і практыка прызначэння мер крымінальнага пакарання. Я не выключаю гэтага, таксама патрэбен сур'ёзны аналіз», — сказаў Валянцін Сукала.

Пры гэтым у 2018 годзе на 2,4 тысячы чалавек была скарочана колькасць асоб, якіх накіравалі ў месцы пазбаўлення волі. Гэта значыць, выбар быў зроблены на карысць альтэрнатыўных відаў пакарання. Пры гэтым Валянцін Сукала падкрэсліў: у Беларусі не настроены на ўзмацненне жорсткасці пакаранняў.

Паводле яго слоў, суды шукаюць аптымальныя пакаранні, якія б сапраўды спрыялі скарачэнню злачыннасці ў цэлым і рэцыдыўнай у прыватнасці.

«Таму казаць пра тое, што ў нас занадта жорсткія падыходы або карная практыка, я б не стаў», — дадаў ён.


**К СВЕДЕНИЮ АКЦИОНЕРОВ**
**ОАО «ВИТЕБСКИЕ КОВРЫ»**
**ГОДОВОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ СОСТОИТСЯ**
**29 марта 2019 г. в 14.00**

Собрание пройдет по месту расположения Общества: г. Витебск, ул. Максима Горького, 75, актовый зал, 3-й этаж административного корпуса.

Регистрация акционеров состоится в день проведения собрания с 12.30 до 13.50.

Для регистрации при себе иметь следующие документы: акционеру общества – паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность. Список лиц, имеющих право на участие в собрании акционеров, составлен на основании реестра владельцев ценных бумаг, сформированного на 7 марта 2019 года.

ПОВЕСТКА ДНЯ:

1. Отчет об итогах работы Общества за 2018 год и задачах по обеспечению выполнения показателей прогноза социально-экономического развития на 2019 год.
2. Отчет наблюдательного совета о работе в 2018 году.
3. Отчет ревизионной комиссии о результатах проверки финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2018 год.
4. Утверждение годового баланса, отчета о прибылях и убытках Общества за 2018 год.
5. О распределении прибыли, полученной в 2018 году, направлениях ее использования в 2019 году и в 1 квартале 2020 года.
6. О размере дивидендов за 2018 год.
7. О сроках выплаты дивидендов за 2018 год.
8. Выборы членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии.
9. Утверждение условий вознаграждения для членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии.

Информация о финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2018 год будет размещена на сайте www.vitcarpet.com с 09.03.2019 года.

С материалами собрания можно ознакомиться в рабочие дни с 22 по 27 марта 2019 г. (с 10.00 до 16.00) в кабинете специалиста по ценным бумагам.

Наблюдательный совет ОАО «Витебские ковры». Тел. 8 (0212) 34 27 06.

УНП 300082076



**ОАО «Красный Октябрь»**
**извещает акционеров о проведении 29 марта 2019 года в 11.00 очередного общего собрания по адресу: г. Витебск, проспект Генерала Людникова, 10**

Повестка дня:

1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2018 год и перспективах развития на 2019 год.
2. Отчет наблюдательного совета о работе в 2018 году.
3. Отчет ревизионной комиссии о работе в 2018 году.
4. Утверждение годового бухгалтерского баланса, отчета о прибылях и убытках Общества за 2018 год.
5. О распределении чистой прибыли Общества и о дивидендах за 2018 год.
6. Об утверждении направлений распределения чистой прибыли, остающейся в распоряжении Общества в 2019 году.
7. О безвозмездной (спонсорской) помощи.
8. Избрание членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии.

С материалами по вопросам повестки дня акционеры могут ознакомиться в приемной Общества с 18 марта по 28 марта 2019 г. в рабочие дни (понедельник–пятница) с 13.30 до 17.00 и 29 марта 2019 г. по месту проведения собрания.

Регистрация лиц, имеющих право на участие в общем собрании акционеров, будет производиться в день проведения собрания с 10.00 до 10.45.

Список лиц, имеющих право на участие в общем собрании, будет составлен на основании реестра владельцев ценных бумаг, сформированного на 1 марта 2019 г.

Для регистрации при себе иметь следующие документы: акционеру общества – паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность.

Справки по тел. 8-0212-52-55-70.

Наблюдательный совет ОАО «Красный Октябрь».

УНП 300003144



**Отчет по использованию имущества Местным фондом издания газеты «Охотник и рыболов» за 2018 г.**

1. Учредителем фонда является Республиканское государственное общественное объединение «Белорусское общество охотников и рыболовов».
2. Имущество фонда составляет:
основные средства – 5,7 тыс. руб.
материальные запасы – 1,0 тыс. руб.
3. Доходы, полученные фондом за 2018 г., – 147,9 тыс. руб.
4. Расходы, понесенные фондом на достижение общественно полезных целей за 2018 г., – 133,2 тыс. руб.
5. Унитарных предприятий и хозяйственных обществ фонд не имеет.

УНП 100163559



**«Уважаемые акционеры**
**ОАО «Слуцкий сахарорафинадный комбинат»!**
**(223610, г. Слуцк, Минская область, ул. Головащенко, 6)**

Во Дворце культуры сахарорафинадного комбината 29 марта 2019 года в 15.00 по адресу: г. Слуцк, Минская область, ул. Головащенко, 6 состоится общее годовое собрание акционеров открытого акционерного общества «Слуцкий сахарорафинадный комбинат».

ПОВЕСТКА ДНЯ:

1. Отчет о результатах деятельности Общества за 2018 год и направлениях развития на 2019 год:
• Отчет Дирекции об итогах финансово-хозяйственной деятельности в 2018 году и основных направлениях деятельности Общества на 2019 год;
• Отчет Наблюдательного Совета о проделанной работе;
• Отчет Ревизионной комиссии о результатах проведенной ревизии в 2018 году и заключение по бухгалтерскому балансу и годовому отчету Общества;
• Утверждение годового отчета, годовой бухгалтерской (финансовой) отчетности за 2018 год с учетом аудиторского заключения;
• Утверждение распределения чистой прибыли, остающейся в распоряжении Общества за 2018 год.
2. Утверждение направлений использования чистой прибыли Общества на 2019 год.
3. Утверждение размера, порядка и сроков выплаты дивидендов за 2018 год.
4. Утверждение размера, условий вознаграждения и компенсации расходов за исполнение своих обязанностей членам Наблюдательного Совета и ревизионной комиссии.
5. Избрание членов Наблюдательного Совета и ревизионной комиссии Общества.
6. Утверждение новой редакции нормативных правовых актов Общества.

Список лиц, имеющих право на участие в собрании, составляется на 1 марта 2019 года.

Регистрация акционеров и их представителей будет осуществляться в день проведения собрания с 14.00 до 15.00 по месту его проведения.

Время и место ознакомления с материалами, предоставляемыми для ознакомления лицам, имеющим право на участие в общем собрании: в рабочие дни, начиная с 09.03.2019 г. по 29.03.2019 г. по месту нахождения Общества с 8.00 до 17.00 (ул. Головащенко, 6, каб. 202, холл второго этажа) или по тел. 801795-45328, а в день его проведения – по месту проведения.

Представителям акционеров при регистрации иметь паспорт, доверенность, оформленную в установленном порядке, акционерам – паспорт.

Дирекция, Наблюдательный Совет ОАО «Слуцкий сахарорафинадный комбинат».

УНП 600075003

СМІ

# НОВАЯ МЕДЫЙНАЯ ПРАСТОРА

**Учора ў сталічным Доме прэсы адбылася выніковая калегія Міністэрства інфармацыі. На ёй падводзілі вынікі 2018 года: што атрымалася добра, а што варта палепшыць. Гучала шмат цікавых ідэй пра тое, як удасканаліць медыйную прастору і ўмацаваць дабрабыт яе стваральнікаў.**




**Міністр інфармацыі Аляксандр КАРЛЮКЕВІЧ** падрабязна расказаў пра заканадаўчыя акты, прынятыя ў медыйнай сферы летась, а таксама звярнуў увагу прысутных на неабходнасць інавацый:

— У частцы законатворчасці мы не можам збаўляць абароты і спыняцца на палове шляху. Варта не толькі назіраць за інфармацыйнай прасторай, але і ўдзельнічаць у ёй. Шмат залежыць ад новых формаў працы медыя... Робячы ўсё па-старому, мы не зможам стварыць новую інфармацыйную прастору. Згодна з новым заканадаўствам, з 1 снежня 2018 года можна рэгістраваць сеткавыя выданні, але пакуль гэтым правам скарысталіся толькі адзінкавыя рэсурсы. А хіба не гэты крок дазваляе стварыць асяроддзе новага характару, а дакладней займаць сваё месца ў асяроддзі, якое ўжо існуе? Друкаваныя тыражы выданняў у дзесяць разоў большыя, чым колькасць наведванняў інтэрнэт-рэсурсаў гэтых выданняў. Навацыі і новая стылістыка змогуць прыйсці толькі тады, калі мы павялічым хуткасць, якая будзе спалучацца з прагрэсам і разуменнем таго, што за інтэрнэт-рэсурсамі — будучыня.

На калегіі згадалі шматлікія мерапрыемствы, што адбываліся ў мінулым годзе — выстаўку «СМІ ў Беларусі», Дзень беларускага пісьменства, фестываль «Славянскі базар у Віцебску» і шмат іншага. У сваю чаргу **намеснік прэм'ер-міністра Ігар ПЕТРЫШЭНКА** даў ацэнку якасці распаўсюджвання друкаванай прадукцыі:

— Трэба наладзіць кнігагандаль у інтэрнэце, у тым ліку выкарыстоўваючы сацыяльныя сеткі. Займіцеся сур'ёзна прапагандай кнігі. Трэба задзейнічаць такі інструмент, як сацыяльная рэклама на тэлебачанні, у метро, у сацыяльных сетках. Трэба выхоўваць свайго чытача. У тым ліку праз правядзенне кніжных выставак — новаўвядзенні сёлетняй Мінскай міжнароднай кніжнай выстаўкі-кірмашу высока ацанілі многія госці. Варта выкарыстаць новыя формы правядзення і арганізацыі выставак, глядзець на замежны вопыт. Тым больш што на замежных



выстаўках супрацоўнікі Міністэрства інфармацыі бываюць даволі часта. Цікавы вопыт на шляху да лічбавання — адкрыццё новага разумнага павільёна «Белсаюздруку». Сучасныя тэхналогіі, камфортны асяродак для людзей — гэта выдатна. Аднак маштабы яго прасоўвання ў краіне даволі сціплыя. Трэба шукаць спосабы паскорыць гэты шлях.

Шмат увагі на сустрэчы было ўдзелена раённым выданням. Звярталася ўвага на патэнцыйную мультымедыйнасць раёнак. Шмат гаварылі і пра відавочную патрэбу забеспячэння жыллём супрацоўнікаў на месцах. Слушнымі прапановамі падзяліўся і **галоўны рэдактар газеты «Навіны Камянеччыны» Віктар ДУЛЕВІЧ:**

— Мы перайшлі на сучасны дызайн «Навін Камянеччыны» і цяпер адпавядаем еўрапейскім узорам. Для таго каб выжыць такому невялікаму выданню, мы адкрылі фотастудыю і цэнтр аператыўнай паліграфіі. Дадатковыя паслугі летась прынеслі нам у шэсць разоў больш сродкаў, чым у 2017 годзе. З-за гэтага стала магчымым падняць заробатную плату супрацоўнікаў газеты на 40 працэнтаў і выйсці на новы ўзровень. Выданні павінны быць прадстаўлены і ў інтэрнэце. «Навіны Камянеччыны» чытаюць ва ўсіх сацыяльных сетках. Цяпер усім трэба працаваць нават не на сайт, а на сацсеткі і на месенджары — «Вайбер» і «Тэлеграм». Важна згадаць і пра маладых спецыялістаў і тых, хто адпрацаваў ужо 10 гадоў. Прапаную на заканадаўчым узроўні вырашыць, каб рэдакцыі ім аплачвалі 100 працэнтаў кошту арэнды жылля, калі мясцовыя ўлады не могуць выдзеліць арэндную жылплошчу.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.**
**Фота Андрэя САЗОНАВА.**

Надвор'е

# Сонца ўсё ярчэйшае і цяплейшае

Але ў першы дзень вясны чакаецца кароткачасовае пахаладанне

**На працягу тыдня ў нас будзе пераважаць няўстойлівае з павышаным тэмпературным фонам надвор'е, паведамілі спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

Сёння ўдзень па паўднёва-заходняй палове краіны чакаецца моцны парывісты вецер. Максімальная тэмпература паветра днём ад плюс 2 да плюс 8 градусаў. У сераду тэрыторыя нашай краіны апынецца ў вобласці павышанага атмасфернага ціску. Будзе пераважна без ападкаў. Уначы тэмпература паветра будзе вагацца ад мінус 5 градусаў да 1 цяпла, а ўдзень максімальна атмасфера прагрэецца да плюс 6 градусаў.

Пераважна без ападкаў чакаецца ўначы на чацвер. Тады толькі месцамі па паўночным усходзе не абыдзецца без кароткачасовых дажджоў. Удзень атмасферныя франты прынясуць на большай частцы тэрыторыі краіны кароткачасовыя ападкі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу, якія будуць суправаджацца парывістым ветрам. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 3 градусаў да плюс 3, а максімальная ўдзень чакаецца ў межах ад 2 да 8 цяпла, па паўднёвым захадзе краіны — да плюс 10 градусаў.

Надвор'е пачне змяняцца ў пятніцу, 1 сакавіка. Да нас закіне атмасферныя франты, за якімі на тэрыторыю краіны пачне паступаць больш халоднае паветра з поўначы Еўропы. Удзень месцамі па краіне пройдзе кароткачасовы снег і мокры снег. Днём чакаецца ад 2 марозу да плюс 5 градусаў.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## Сталічны ЧАС

● У арганізацыі сталіцы летась паступіла звыш сямі мільярдаў долараў замежных інвестыцый. Пра гэта агенцтву «Мінск-Навіны» паведамілі ў Галоўным статыстычным упраўленні Мінска. Сталіца застаецца самым прывабным рэгіёнам для прыцягнення замежных інвестыцый. У мінскія арганізацыі ўкладзена 65,4 працэнта ад валавога паступлення замежных інвестыцый у краіну. Сродкі паступілі з 91 краіны.

● З 6 па 8 сакавіка ў сталіцы будзе арганізаваны дадатковы гандаль кветкамі на адкрытых пляцоўках, паведамілі ў галоўным упраўленні гандлю і паслуг Мінгарвыканкама. Усяго вызначана каля 200 такіх пунктаў. У Цэнтральным раёне будзе 21 пляцоўка, у Фрунзенскім — 44, у Заводскім — 22, Ленінскім — 28, Савецкім — 20, Першамайскім — 16, Партызанскім — 15, Маскоўскім і Кастрычніцкім — па 18.

# 333 АЎТАМАБІЛІ

## прыпадае ў Беларусі на кожную тысячу чалавек

**Пра статыстыку і перспектывы развіцця беларускага аўтамабільнага рынку паведамілі журналістам у Нацыянальным прэс-цэнтры першы намеснік міністра прамысловасці Генадзь Свідэрскі, старшыня праўлення Беларускай аўтамабільнай асацыяцыі Сяргей Міхневіч і яе ж генеральны дырэктар Аляксандр Сідарэвіч. Крыху цікавых лічбаў адтуль.**

У краіне за мінулы 2018 год было прададзена 52 835 новых аўтамабіляў (членамі БАА). У параўнанні з 2017 годам такі продаж налічыў 34 255 машын — прырост склаў 54 %. Што цікава, у 2014—2016 гадах продаж новых аўто трымаўся на ўзроўні 24—26 тысяч машын, два апошнія гады дэманструюць актыўны рост гэтага сегмента рынку. Фізічных асоб сярод пакупнікоў 59 %, адпаведна юрыдычных — 41. Як бачыце, усё больш грамадзян нашай краіны аддаюць перавагу новым транспартным сродкам перад патрыманымі. Гэта стала магчыма ў значнай ступені дзякуючы прывабным прапановам дылераў і банкаў па крэдытаванні, лізінгу і зніжках на новыя аўто як беларускай зборкі, так і з іншых краін.

Пяцёрку лідараў у продажы новых аўтамабіляў склалі Renault, LADA, Volkswagen, Geely і Škoda, дзясятак дапаўняюць Nissan, Kia, Hyundai, GAZ і Ford. Кітайска-беларускі вытворца легкавых аўто цвёрда трымаецца сярод лідараў і збіраецца далей нарошчваць колькасць продаж на беларускім рынку, а дакладней — у два разы.

А вось якія новыя аўтамабілі куплялі беларусы (ці грамадзяне іншых краін у Беларусі) у 2018 годзе. Вашай увазе — дзясятак самых папулярных і колькасць прададзеных экземпляраў (членамі БАА):

1. LADA Vesta (5269), 2. Volkswagen Polo (4908), 3. Renault Logan (3250), 4. Renault Sandero Stepway (2976), 5. Renault Duster (2359), 6. Geely Atlas (2315), 7. Škoda Rapid (1972), 8. LADA Largus (1950), 9. Renault Kaptur (1783), 10. Hyundai Creta (1346).

Што цікава, Беларусь па аўтамабілізацыі насельніцтва апярэджвае ўсе краіны СНД: у нас на 1000 чалавек прыходзіцца 333 аўтамабілі, а, напрыклад, у Расіі — 324. Колькасць прададзеных за мінулы год новых аўто — 4,6 адзінкі на тую ж тысячу (у Расіі — 10). Усяго ў нашай краіне зарэгістравана звыш 3 млн 159 тыс. толькі легкавых аўтамабіляў.

**Іван КУПАРВАС.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Папа Рымскі папрасіў зрабіць каталіцкую царкву бяспечнай для дзяцей



Папа Рымскі Францыск заклікаў зрабіць цэрквы і ўсе месцы адпраўлення культу цалкам бяспечнымі для дзяцей, перадае Reuters. Пра гэта ён расказаў у рамках сустрэчы, прысвечанай абароне непаўналетніх у Царкве, якія падвяргаюцца сексуальнаму гвалту. Папа Францішак заклікаў да ўсеагульнай барацьбы з агідным злачынствам, якое павінна быць сцёрта з твару зямлі. «Праблема сексуальных дамаганняў у адносінах да непаўналетніх з боку сябраў кліру даўно выклікала гучны скандал у Царкве», — дадаў Папа Рымскі. Ён падкрэсліў, што неабходна зрабіць Царкву бяспечнай для непаўналетніх, «каб падобныя злачынствы не паўтараліся зноў». Для ажыццяўлення гэтай мэты Папа Рымскі Францыск заклікаў да супрацоўніцтва «з усімі людзьмі добрай волі і ўсімі пазітыўнымі сіламі грамадства ва ўсіх краінах і на міжнародным узроўні».

## Паўторнае галасаванне па здзелцы з ЕС аб «брэксіце» адбудзецца да 12 сакавіка



Пра гэта заявіла прэм'ер-міністр Вялікабрытаніі Тэрэза Мэй, словы якой прыводзіць агенцтва Reuters. «Паўнавартаснага галасавання ў парламенце на наступным тыдні не будзе, але мы гарантуем, што гэта адбудзецца да 12 сакавіка», — сказала Мэй. Яна выказала надзею на тое, што выхад з ЕС 29 сакавіка адбудзецца ва ўпарадкаванай форме са здзелкай, якая будзе адобрана і Лонданам, і Брусэлем. Парламент патрабуе, каб у тэкст пагаднення, зацверджанага на лістападаўскім саміце ЕС, былі ўнесены змены, што датычацца механізму «бэкстоп», які захавае сяброўства Паўночнай Ірландыі ў мытным саюзе і адзіным рынку ЕС, каб не дапусціць з'яўлення памежнай інфраструктуры на брытанска-ірландскай мяжы. 26 лютага Мэй мае намер праінфармаваць парламентарыяў аб ходзе перагаворнага працэсу, а на наступны дзень у парламенце адбудуцца дэбаты, па выніках якіх дэпутаты змогуць прапанаваць свае папраўкі да біля аб «брэксіце».

## Грамадзянам ААЭ даруюць амаль 100 мільёнаў долараў даўгоў

Урад Аб'яднаных Арабскіх Эміратаў дамовіўся з 13 банкамі аб спісанні даўгоў жыхарам краіны на агульную суму 361 мільён дзірхамаў (больш за 98 мільёнаў долараў). Пра гэта паведамляе выданне Gulfnews. У праграму «пазыковай амністыі» трапілі больш за тры тысячы чалавек, у якіх былі запазычанасці перад крэдытнымі арганізацыямі. Па словах старшыні Найвышэйшага камітэта Фонду ўрэгулявання запазычанасці ўрада краіны Джабер Махамада Аль Сувейдзі, гэта было зроблена для таго, каб забяспечыць годны ўзровень жыцця ўсіх грамадзян і падтрымаць максімальна магчымы ўзровень сацыяльнай стабільнасці. Да 2017-га нявыплата падаткаў у ААЭ была крымінальным злачынствам. Пазней пакаранне змянілі на менш суровае: зараз на парушальнікаў накладваюць штрафы. Улады ААЭ рэгулярна аб'яўляюць аб спісанні запазычанасці насельніцтва. Так, у 2012 годзе больш як шасці тысячам чалавек даравалі каля 540 мільёнаў долараў.

# ПРАД'ЯВІЦЕ ПАШПАРТ!


Адвакат спецыялізаванай юрыдычнай кансультацыі № 1 па прававым абслугоўванні суб'ектаў гаспадарання Мінска Кацярына ЛЯЎЧУК.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Таксама, завалодаўшы чужымі пашпартнымі данымі, ашуканцы могуць зарэгістраваць фірму і ажыццяўляць праз яе незаконныя аперацыі. Часта ўладальніка пашпарта прызначаюць фармальным дырэктарам такой канторы. У далейшым праз гэтую фірму пераводзяцца ў наяўныя або абезнаяўліваюцца грашовыя сродкі, здзяйсняюцца іншыя незаконныя дзеянні. І менавіта чалавек, чыімі пашпартнымі данымі скарысталіся, будзе прыцягнуты ў далейшым да адказнасці за супрацьпраўныя ўчынкі ашуканцаў, калі не зможа даказаць сваю невінаватасць. «У маёй практыцы былі такія справы, над адной з іх я працую якраз цяпер, — кажа Кацярына Ляўчук. — У прыватнасці, яна датычыцца артыкула 243 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь і мае на ўвазе ўхіленне ад выплаты падаткаў».

З дапамогай чужых пашпартных даных можна таксама здзяйсняць розныя махінацыі ў інтэрнэце. Цяпер, у эпоху глабальных сетак, гэта вельмі распаўсюджана, папяраджвае Кацярына Ляўчук. Напрыклад, ашуканцы могуць адкрыць на ваша імя электронны кашалёк, здзяйсняць махлярства ў анлайн-гульнях і інш.

Наогул, што датычыцца інтэрнэту, тут любому можна параіць быць уважлівым і ўводзіць свае даныя толькі на правераных рэсурсах, напрыклад, на афіцыйных сайтах дзяржаўных органаў або партале дзяржаўных паслуг.

Тэарэтычна з дапамогай скрадзенага пашпарта можна нават перааформіць на іншую асобу кватэру. Але на самай справе кантроль за такімі здзелкамі ў нашай краіне вельмі строгі. Дарэчы, і пры выдачы крэдытаў праверка таксама апошнім часам стала значна больш жорсткай. Таму выпадкі такога махлярства сустракаюцца ўсё радзей, кажа юрыст. Тым не менш яна рэкамендуе не абнародаваць свае персанальныя даныя без асаблівай падставы.

## Што рабіць, калі дакумент скралі ці ён згублены?

«Трэба звярнуцца ў РАУС і напісаць заяву аб крадзяжы, — кажа наш эксперт. — У РАУС пасля гэтага вы атрымаеце талон аб рэгістрацыі вашай заявы. Ён будзе з'яўляцца падставай для таго, каб вам пасля выдалі новы пашпарт».

У выпадку згубы пашпарта таксама трэба як мага хутчэй звярнуцца ў міліцыю, каб дакумент унеслі ў спецыяльную базу і прызналі несапраўдным. Тады ніхто не зможа здзейсніць якія-небудзь супрацьпраўныя дзеянні з яго дапамогай, тлумачыць Кацярына Ляўчук. Далей вам будзе выдадзены новы пашпарт. Для гэтага трэба будзе звярнуцца ў органы ўнутраных спраў па месцы жыхарства, у аддзел па грамадзянстве і міграцыі з заявай і аплаціць дзяржаўную пошліну (адну базавую велічыню, якая на сёння складае 25,5 рубля).

## Што рабіць у такім выпадку ў іншай краіне?

Неабходна звярнуцца ў консульскую ўстанову або дыпламатычнае прадстаўніцтва Рэспублікі Беларусь у гэтай краіне. Спіс іх ёсць у інтэрнэце. Калі ў згаданай краіне няма беларускіх дыпламатычных устаноў, прыйдзецца звярнуцца ў бліжэйшую суседнюю дзяржаву або, у крайнім выпадку, у амбасаду Расіі.

У гэтым выпадку вам выдадуць пасведчанне на вяртанне ў Рэспубліку Беларусь. Яно фактычна будзе замяняць пашпарт на час вашага знаходжання за мяжой. А пасля вяртання дадому вам трэба будзе з'явіцца ў аддзел па грамадзянстве і міграцыі з заявай і атрыманым у консульстве дакументам, каб атрымаць новы пашпарт.

**Святлана БУСЬКО.**

**Каментарый з нагоды**

## НЕ ПАГАДЖАЙЦЕСЯ НІ НА ЯКІЯ СХЕМЫ

**Начальнік аддзела па раскрыцці рабаванняў, разбояў і іншых злачынстваў супраць уласнасці галоўнага ўпраўлення крымінальнага вышуку МУС Беларусі Васіль ШУПЛЯК:**

— Некалькі гадоў таму ў Брэсцкай вобласці мела месца сітуацыя, калі махляр, абяцаючы выпіўку, угаворваў асацыяльных асоб аформіць на свой пашпарт растэрміноўку на розныя пакупкі — ад мабільнага тэлефона да тэлевізараў і халадзільнікаў. Пры гэтым для падстрахоўкі, каб у краме ці ў банку не ўзнікала сумневаў, што гэтыя асобы з'яўляюцца плацежаздольнымі, пакідаў свой нумар у якасці тэлефона іх работадаўца. Людзей, на чые пашпарты афармляліся пакупкі, ён падманваў, запэўніваючы, што з розных прычын не можа аформіць гэта на сябе, прытым абяцаў, што будзе спраўна ўсё сам аплачваць.

У выніку даўжнікамі банкаў і крамаў станавіліся, вядома ж, падстаўленыя ім людзі. Такім чынам ён падмануў звыш дзесяці чалавек. У рэшце рэшт усё скончылася тым, што гэты махляр быў прыцягнуты да крымінальнай адказнасці. Нядаўна такія ж схемы былі выяўленыя праваахоўнікамі ў Гомельскай вобласці і ў Мінску. Па азначаных злачынствах ужо распачатыя крымінальныя справы, вінаватыя будуць пакараныя.

Мараль жа сказанага ў тым, што нельга давяраць свае пашпартныя даныя і згаджацца на падобныя схемы, бо, калі растэрміноўка або крэдыт будуць аформлены на вас, расплачвацца за ўсё давядзецца вам.

Здараюцца сітуацыі, калі асобы з алкагольнай залежнасцю, якім ужо ніхто не дасць ніякага крэдыту, самі афармляюць на свой пашпарт і бяруць напракат розны інструментарый, ад балгаркі да шрубавёрта, а затым нясуць і закладваюць яго ў ламбард. Грошы ідуць на выпіўку. Такія «дзялкі», мабыць, лічаць, што не будуць прыцягнутыя да крымінальнай адказнасці і ўсё абмяжуецца толькі адміністрацыйным артыкулам. Гэта не так, такія дзеянні падпадаюць пад крымінальны артыкул.

Здарэнні

## Спынілі злачынныя «гастролі» замежнікаў

**Супрацоўнікі галоўнага ўпраўлення крымінальнага вышуку МУС сумесна з калегамі з Гродзенскай, Брэсцкай, а таксама Мінскай абласцей пры сілавой падтрымцы байцоў спецпадраздзялення «Алмаз» з доказамі злачынства пасля здзяйснення крадзяжу з кватэры ў Салігорску затрымалі двух удзельнікаў міжнароднай злачыннай групы. Пра гэта паведамілі ў МУС.**

Канфіскаваныя прылады злачынства, скрадзенае, прызнанні затрыманых, а таксама іншыя фактары даюць падставы сцвярджаць, што названыя асобы датычныя да здзяйснення каля 50 кватэрных крадзяжоў шляхам адціскання вокнаў ПВХ.

Злачынствы здзяйсняліся з чэрвеня мінулага года. Як правіла, зламыснікі выбіралі кватэры на першых паверхах дамоў, а таксама катэджы. У асноўным выкрадаліся грошы і ювелірныя ўпрыгажэнні. Пры першых вылазках злодзеі не грэбавалі біжутэрыяй, прадуктамі харчавання, касметыкай, адзеннем і абуткам.

Арэал крымінальнай дзейнасці распаўсюджваўся на населеныя пункты літаральна ўсіх абласцей краіны. Больш за ўсё «пацярпелі» Салігорск, Кобрын, Магілёў і Гродна. Характар злачынстваў, іх цыклічнасць дазвалялі міліцыянерам разглядаць версію, што гэта справа рук так званых гастралёраў.

Раскрыццё серыі згаданых злачынстваў знаходзілася на асабістым кантролі кіраўніцтва міліцэйскага ведамства. Першыя «зачэпкі» атрымалі супрацоўнікі міліцыі Гродзеншчыны. Паводле аператыўнай інфармацыі, крадзяжы здзяйсняліся грамадзянінам Украіны, раней судзімым за аналагічныя злачынствы на радзіме, а таксама грамадзянінам Расіі. Першапачаткова ён у памочнікі яны прыцягвалі кагосьці з шасцярых грамадзян Украіны (усе з 1983 да 1990 года нараджэння).

Зламыснікі выконвалі строгія меры канспірацыі. Прыбывалі ў Беларусь з тэрыторыі Украіны ці Расіі розным транспартам, у тым ліку грамадскім або ўзятым напракат, а таксама пешшу. Сродкамі сувязі не карысталіся, для маскіроўкі пераапраналіся.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Крыміналу — не

# ЖЫЦЬ ПА СРОДКАХ

### У пракуратуры Мінскай вобласці назвалі самыя карумпаваныя сферы

**У лік самых карумпаваных у Мінскай вобласці за мінулы год трапіла транспартная сфера — 24,1 % ад агульнай колькасці. У асноўным факты датычацца кантролю за пропускам грузаў Міністэрства транспарту, калі яго прапускалі з перавышэннем дазволенага танажу. На другім месцы — сельская гаспадарка і прадпрыемствы аграпрамысловага комплексу — 17,5 %. Разова, як правіла, ідзе аб парушэннях пры закупках прадукцыі і разліках. Абласная пракуратура выходзіла з прапановай у зацікаўленыя органы зрабіць гэтую працэдуру больш празрыстай. Трэцюю пазіцыю трымае апарат дзяржаўнага кіравання — 37 злачынстваў.**

## СТРАЦІЛІ ІНСТЫНКТ САМАЗАХАВАННЯ

Усяго ж на Міншчыне летась выяўлена 381 карупцыйнае злачынства. Гэта на 85 % больш за папярэдні год. На 44 % павялічылася і колькасць асоб, якія за іх здзяйсненне прыцягнуты да крымінальнай адказнасці.

— Найбольшая колькасць іх зафіксавана ў Мінскім, Салігорскім, Барысаўскім, Маладзечанскім, Смалявіцкім раёнах і горадзе Жодзіна, — адзначыў **намеснік пракурора Мінскай вобласці Аляксандр БЕЛІЦКІ.** На яго думку, выяўленню такой колькасці злачынстваў карупцыйнай накіраванасці садзейнічала мэтанакіраваная і зладжаная работа ўсіх праваахоўных органаў вобласці.

— Прэзідэнт краіны Аляксандр Лукашэнка аддае самую пільную ўвагу праблеме карупцыі. Але, відаць, людзі, якія прызначаюцца на адказныя пасады, забываюць пра тое, што ў нас не вельмі вялікая краіна. Таму пра чалавека, які тут нарадзіўся, працуе, можна даведацца практычна ўсё, у тым ліку і за якія сродкі ён жыве, — упэўнены **пракурор Мінскай вобласці Алег ЛАЎРУХІН.** — Напэўна, высокія пасты дурманяць некаторым галаву і яны страчваюць інстынкт самазахавання.

## «ДЗЕДАЎШЧЫНЕ» — ЗАСЛОН

У мінулым годзе грамадскасць узбударажыла справа радавога Коржыча, які служыў у 72-м аб'яднаным вучэбным цэнтры ў Печах. Там сапраўды былі выяўлены факты парушэння ўстаўных правіл паміж ваеннаслужачымі. Што зроблена, каб спыніць так званую дзедаўшчыну ў войску?

— Летась у параўнанні з 2017 годам колькасць здзейсненых злачынстваў, звязаных з парушэннем устаўных правіл узаемаадносін паміж ваеннаслужачымі, знізілася на 72 працэнты, — канстатаваў **намеснік пракурора Сяргей ШЫКУНЕЦ.** — Большасць іх прыходзілася на 72-і цэнтр у Печах. — У пяці часцях Цэнтра ў казармах устаноўлена 256 камер відэаназірання з кругласутачным запісам. І работа ў гэтым напрамку працягваецца. Акрамя таго, ваеннаслужачым тэрміновай службы дазволена пастаянна карыстацца мабільнымі тэлефонамі, у агульнадаступных месцах размешчаны тэлефоны даверу камандавання, Камітэта салдацкіх маці, Следчага камітэта, пракуратуры і міліцыі.

## ТОЛЬКІ РАЗАМ, УСЁЙ ТАЛАКОЙ

На Міншчыне ўмацаванню правапарадку і законнасці пасадзейнічала работа пракуратуры ва ўзаемадзеянні з праваахоўнымі органамі, арганізацыйныя, практычныя меры па павышэнні эфектыўнасці пракурорскага нагляду і яго праваабарончага складніка, — падзяліўся сваімі меркаваннямі Алег Лаўрухін.

У прыватнасці, летась на 3,5 % скарацілася колькасць злачынстваў. У 2017 годзе іх здзейснена 16,5 тысячы, у мінулым годзе — 15,9 тысячы. Знізіўся і ўзровень злачыннасці ў разліку на дзесяць тысяч насельніцтва — са 116 да 111 выпадкаў.

У той жа час павялічылася колькасць крадзяжоў з выкарыстаннем камп'ютарнай тэхнікі, прысвойвання або растраты фінансаў і матэрыяльных каштоўнасцяў, махлярства, хуліганства. У Бярэзінскім, Лагойскім, Любанскім, Уздзенскім, Нясвіжскім, Вілейскім раёнах назіраецца рост злачыннасці, забойстваў — у Барысаўскім, Любанскім, Уздзенскім раёнах і горадзе Жодзіна. Прычым 37,5 % забойстваў носяць сямейна-бытавы характар.

У першым паўгоддзі 2019-га пракуратурай запланаваны мерапрыемствы, якія могуць паўплываць на паляпшэнне крыміногеннай абстаноўкі. Пракуроры правядуць шматлікія праверкі наконт выканання мерапрыемстваў дзяржаўных праграм, мэтавага і эфектыўнага выкарыстання бюджэтных сродкаў, што выдзяляюцца на іх рэалізацыю. Будзе праверана работа органаў унутраных спраў па выкананні заканадаўства аб прафілактыцы гвалту ў сям'і, эфектыўнасць мер мясцовых органаў улады па кантролі ў галіне будаўніцтва, законнасці падаўжэння тэрмінаў будаўніцтва жылых дамоў.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

# «ГАВАРЫ СА МНОЙ ПА-БЕЛАРУСКУ»



## Сучасная і ўзорная

Напачатку яна была сямігодкай, зараз гэта сярэдняя школа, якую можна назваць узорнай. Значную ролю ў яе аднаўленні адыграў мясцовы калгас. З яго дапамогай школу практычна нанова адбудавалі: усюды навясныя столі, скураная мэбля, на калідорах — куткі адпачынку з фантанамі. Стыль кожнага класа распрацоўваў дызайнер. Сюды прыязджаюць не толькі госці з усяе краіны, але і з-за мяжы.

Дарэчы, шматлікія дэлегацыі ў вытворчым кааператыве імя В. І. Крамко — справа, можна сказаць, звычайная. Гаспадарка — адна з перадавых не толькі ў рэгіёне, але і ў краіне. Для выпускнікоў існуюць добрыя прэферэнцыі. Тых, хто вяртаецца сюды маладым спецыялістам, калгас гатовы вучыць за ўласныя сродкі.

**«У значнай ступені навучанне на роднай мове — гэта яшчэ і выхаванне ўсебакова развітога чалавека, сапраўднага патрыёта, які любіць сваю краіну і сваю малую радзіму».**

У школе ж зацікаўлены ў тым, каб прыняць на працу сваіх былых выпускнікоў. За гэты час склалася не адна настаўніцкая дынастыя. Такі падыход, лічыць намеснік дырэктара Аліна Коўган, важны для стабільнай беларускай платформы. Да таго ж настаўніку, які сам вучыўся па-беларуску, значна лягчэй выкладаць тую ж фізіку альбо грамадазнаўства...

## Мова з першых крокаў

Гадоў дзесяць таму было крыху больш за 300 школьнікаў, зараз у межах 180. Але затое гэта колькасць стабільная на працягу некалькіх гадоў. Паступова павялічваюцца дашкольныя групы. Дарэчы, таксама беларускамоўныя.

— Раней некаторыя бацькі ўказвалі ў заяўцы рускую мову, гэта адбывалася аўтаматычна. Але вось ужо некалькі гадоў не памыляюцца, бо ведаюць, што іх дзеці пасля садка пойдуць у беларускамоўную школу, — кажа **загадчыца дзіцячага сада Ірына ЮХНЕЎСКАЯ.** — За ўвесь час толькі адзін бацька быў настроены катэгарычна, але мы здолелі пераканаць яго на карысць роднай мовы і да гэтай тэмы больш не вярталіся.

На думку педагога, важна з дзяцінства прывіць смак да беларускай мовы. Такі падыход абумоўлены і спецыфікай школы. З багажом моўных ведаў дзіця лягчэй уцягнецца ў вучобу, — упэўнена Ірына Раманаўна.

Увесь час выхавальнікі ў садку размаўляюць з дзеткамі па-беларуску. На роднай мове вядуцца заняткі. Не ўсе дзеці напачатку разумеюць, пра што гаворка. Таму многія словы трэба перакладаць.

— Напрыклад, у малодшай групе выхавальнік знаёміць дзяцей з колерам і кажа: «Паглядзіце, гэты шарык чырвоны». Дзеці ў адказ: «Не, ён «красный». І выхавальнік не скажа, што дзеці не маюць рацыі. Ён растлумачыць, што можна сказаць і так, і гэтак. На рускай мове — «красный», на беларускай — «чырвоны». Малыя хутка гэта засвойваюць.

**Напачатку яна была сямігодкай, зараз гэта сярэдняя школа, якую можна назваць узорнай.**

Разам з мовай дзеткі знаёмяцца з культурай і нацыянальнымі традыцыямі беларусаў. Яны вучаць песні, прыказкі і прымаўкі, вершы і танцы. Перад выпускам старшая група праводзіць «вячоркі», дзе ўсе надзяваюць нацыянальнае адзенне і дэманструюць, чаму навучыліся.

## Ад «Сваёй гульні» да вандроўкі з фотакамерай

Прыемна здзівіла, як вучні ў школе вітаюць незнаёмых людзей. Прычым усіх, хто ідзе насустрач. Часта можна пачуць: «Добры дзень». На дзвярах кабінетаў заўважаю лісткі з цытатамі аб роднай мове, на адных дзвярах — абведзеная далонь, на якой усе пальцы пералічаны па-беларуску.

І хаця «беларускасці» ў Квасоўскай школе даволі шмат, будзе неправільным казаць, што ўсе школьнікі размаўляюць па-беларуску. Паміж сабой большасць гутарыць на рускай мове. Таму тыдзень роднай мовы і літаратуры, прымеркаваны да Міжнароднага дня роднай мовы, складаецца такім чынам, каб прывучыць вучняў карыстацца сваёй мовай не толькі на ўроках, але і ў штодзённым жыцці. Дзеля гэтага тут прыдумалі нямала цікавых акцый і мерапрыемстваў.

Напрыклад, папулярную праграму «Свая гульня» тут прысвяцілі роднай мове. Старшакласнікі ўзялі фотакамеру і адправіліся вандраваць па сваёй роднай вёсцы. Яны складуць віртуальны альбом пра Квасоўку. У школе ёсць свая радыёстудыя, якая выходзіць у эфір штодзень падчас перапынкаў. На працягу тыдня тут мяркуюць выдаць некалькі праграм да Дня роднай мовы. Конкурсы вершаў, песень, віктарыны, гульні і нават прэзентацыя вершаў юных паэтаў — такі багаж тыдня роднай мовы ў Квасоўскай сярэдняй школе. Пры гэтым галоўная ўмова — размаўляць па-беларуску паўсюдна. За гэта будуць налічвацца дадатковыя балы.

Але не толькі тыдзень жыве мова ў пазашкольным асяроддзі. Вучні ўдзельнічаюць у этнаграфічных святах, знаёмяцца з гісторыяй сваёй малой радзімы ў школьным музеі. Фізкультурныя хвілінкі для малодшых школьнікаў тут праводзяць пад беларускую сучасную і народную музыку. Маладыя настаўніцы, дарэчы, выпускніцы школы, Наталля Цыбульская і Маргарыта Рахунок ставяць спектаклі на беларускай мове. Аб іх пастаноўцы «У вайны не жаночы твар» па творах Святланы Алексіевіч ведае ўвесь раён.

## Што будзе з багажом?

Сапраўды, усе школьнікі атрымліваюць даволі важкі багаж «беларускасці». Але ці працуе ён пасля выхаду выпускнікоў за межы школы? У пэўнай ступені гэта так. Як ужо гаварылася, некаторыя выпускнікі школы вяртаюцца пасля ВНУ назад і працуюць настаўнікамі. Тым самым працягваюць масткі ад мінулага ў будучыню.

Як высветлілася, тут таксама ёсць рэзерв. Пашырыць беларускамоўную прастору можа... эканоміка. Будучы маркетолаг, а пакуль вучаніца 11 класа Ксенія Хрыптовіч бачыць прамое выкарыстанне ведаў роднай мовы ў стварэнні таварных брэндаў для прасоўвання іх на беларускі і замежныя рынкі.

У Ксеніі Якубені, вучаніцы 9 класа, будучыня пакуль размытая: яна яшчэ не ведае, кім хоча працаваць. Але схільнасць да мовы вызначаецца канкрэтнымі поспехамі: дзяўчына неаднойчы станавілася прызёрам раённай алімпіяды па беларускай мове. Яна лічыць, што беларускамоўнае асяроддзе пашырэцца за кошт сталіцы, а вось у вёсках размаўляюць у асноўным на «трасянцы». Захаваць такім чынам культуру мовы немагчыма, упэўнена старшакласніца. Пры тым што ў большасці ВНУ навучанне вядзецца на рускай мове. А вось школы здольныя захаваць высокі ўзровень моўнага асяроддзя.

**Важна з дзяцінства прывіць смак да беларускай мовы. З багажом моўных ведаў дзіця лягчэй уцягнецца ў вучобу.**

— Што значыць беларускамоўная школа? — задаецца пытаннем **дырэктар школы Алег ХРЫПТОВІЧ.** — Гэта значыць, што мы павінны не проста выкладаць прадметы, але і заяўляць аб сабе. З апошніх дасягненняў — другое месца на рэспубліканскім этапе конкурсу «Чытаем па-беларуску з velcom», які праводзіўся сумесна з Міністэрствам адукацыі. Нашы выпускнікі дасягаюць добрых вынікаў на ЦТ. У значнай ступені навучанне на роднай мове — гэта яшчэ і выхаванне ўсебакова развітога чалавека, сапраўднага патрыёта, які любіць сваю краіну і сваю малую радзіму. Гэту традыцыю мы будзем працягваць.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

---

Вышэйшая школа

# Рэйтынгавая сістэма — не «селекцыя»,

## а шанц для выкладчыкаў

**«Наша задача — навучыць студэнта творча думаць, задаваць пытанні, ставіць мэты і аналізаваць вучэбныя вынікі, каб атрымаць на выхадзе спецыяліста, гатовага дзейнічаць ва ўмовах нявызначанасці, у сітуацыі, калі няма гатовых рэцэптаў», — такую думку выказаў падчас відэабрыфінгу на сайце Нацыянальнага прэс-цэнтра рэктар Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта Андрэй КАРОЛЬ.**

«Выкладчыкам таксама трэба навучыцца па-іншаму выстройваць свае стасункі са студэнтамі. Неабходна навучыць іх ствараць свой прадукт, забяспечыць умовы, каб кожны з іх мог рэалізаваць сябе ў вучэбнай дзейнасці», — падкрэсліў Андрэй Кароль.

Па словах рэктара, у БДУ распрацаваная стратэгія развіцця ўніверсітэта, якая ўключае асноўныя стратэгічныя і тактычныя мэты і задачы па кожным з ключавых для ўніверсітэта кірункаў дзейнасці — адукацыйным, навуковым, выхаваўчым... Адна з фундаментальных мэт — кадравая палітыка ва ўніверсітэце.

— Мы перагледзелі многія нашы нарматыўныя прававыя акты ва ўніверсітэце, узгаднілі іх з прафкамам і зацвердзілі на канферэнцыі працоўнага калектыву. Прывязалі заработную плату работнікаў да прадукцыйнасці іх працы, — паведаміў Андрэй Кароль. — Для гэтага ёсць канкрэтныя механізмы. Калі браць прафесарска-выкладчыцкі склад, то была распрацаваная рэйтынгавая сістэма матывацыі і стымулявання прадукцыйнасці працы, і кожны выкладчык ведае арыенціры, якіх ён можа дасягнуць.

У рэйтынгавай сістэме вынікі ацэньваюцца па аб'ектыўных крытэрыях, якія адлюстроўваюць вучэбна-метадычную, навуковую, арганізацыйную і выхаваўчую работу выкладчыкаў. Гэтыя крытэрыі будуць штогод карэктавацца ў залежнасці ад прыярытэтных задач развіцця БДУ. Тэхнічная ўнікальнасць рэйтынга ПВС заключаецца ў поўнай аўтаматызацыі працэсаў выстаўлення рэйтынгавай ацэнкі, разліку і прызначэння прэмій. Гэта дазваляе мінімізаваць суб'ектыўны фактар пры аналізе паказчыкаў эфектыўнасці работы выкладчыкаў. Усе справаздачы, якія яны прадстаўляюць, запаўняюцца і верыфікуюцца ў электронным выглядзе ў асабістых кабінетах супрацоўнікаў. Перад укараненнем рэйтынгавай сістэмы яна на працягу чатырох месяцаў абмяркоўвалася ў працоўных калектывах факультэтаў БДУ.

— Штомесяц выкладчык мае магчымасць атрымліваць больш, чым той, хто менш эфектыўны ў сваёй рабоце. Дадатковая прэмія па выніках рэйтынгавых ацэнак у залежнасці ад індывідуальных паказчыкаў можа вагацца ад 69 да 320—350 рублёў. Гэта не значыць, што праводзіцца «селекцыя», — падкрэслівае Андрэй Кароль. — Простага мы ўвасабляем у жыццё прынцып: «Калі хочаш быць шчаслівы — будзь ім». Стаўленне выкладчыкаў да перамен мы ўжо бачым. Яны цяпер разумеюць неабходнасць паўдзельнічаць у тым ці іншым міжнародным праекце, падрыхтаваць і апублікаваць свой артыкул у часопісе Scopus або базе даных Web of Science. І гэта ўсё працуе на агульную скарбонку дасягненняў універсітэта. Гэты працэс быў досыць скрупулёзны, і тут няма нейкага дырэктыўнага ціску. Сёння мы маем абсалютна выразны па змесце і працэдуры механізм ацэньвання, які вызначае паспяховасць працы любога выкладчыка. Рэалізуецца прынцып празрыстасці і адкрытасці, а галоўнае, мы істотна скарацілі зусім непатрэбны дакументаабарот, калі кожны кіраўнік справаздаваў даказаць, што яго супрацоўнік — выключны. Цяпер з'явіліся дакладныя крытэрыі паспяховасці і эфектыўнасці кожнага.

Для ўсіх іншых катэгорый работнікаў універсітэта — кіраўнікоў службаў і аддзелаў, лабарантаў, спецыялістаў, метадыстаў — таксама ўстаноўлены крытэрыі эфектыўнасці. Ёсць дакладны парадак, за што прэміруюць супрацоўнікаў. Кіраўнік падраздзялення сам прымае рашэнне аб выніковасці іх працы, а кіраўнікоў прэміруе спецыяльна створаная камісія ва ўніверсітэце.

«Праз рэалізацыю кадравай палітыкі мы маем унікальныя і для БДУ, і для ўсёй краіны вынікі ў навуковай дзейнасці, — дадаў Андрэй Кароль. — Летась ва ўніверсітэце была абаронена і зацверджана 71 кандыдацкая дысертацыя і 8 доктарскіх».

Таксама ў 2019 годзе ў БДУ заснаваны конкурс на атрыманне грантаў рэктара для падрыхтоўкі кандыдацкіх і доктарскіх дысертацый. Мэта — павелічэнне колькасці спецыялістаў з вучонай ступенню. У прыватнасці, сродкі гранта будуць вылучацца на публікацыі вынікаў навуковай працы, набыццё матэрыялаў і абсталявання, аплату ўдзелу ў навуковых мерапрыемствах і іншыя выдаткі, звязаныя з падрыхтоўкай і абаронай дысертацыі. Конкурс будзе праводзіцца штогод са студзеня да сакавіка. Для падрыхтоўкі кандыдацкай дысертацыі прадугледжаны грант на тэрмін да двух гадоў, а для доктарскай — да трох. Усяго будуць вызначаны тры ўладальнікі з ліку патэнцыяльных кандыдатаў навук і пяць — з тых, хто рыхтуе доктарскую дысертацыю.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА по продаже права заключения договоров аренды недвижимого имущества

**Организатор:** государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел. (0212) 24-63-14.

**Продавец:** республиканское унитарное предприятие почтовой связи «Белпочта», Витебский филиал, г. Витебск, пр-т Московский, 10, тел. (0212) 60-19-62

**Лот № 1**. Право заключения договора аренды сроком на 5 лет помещения площадью 43,4 кв. м, расположенного на 2-м этаже изолированного помещения с инв. № 200/D-107228 (отделение связи № 32) по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Чкалова, 34, пом. 1, для размещения офисов, складских помещений, оказания услуг, организации производства (кроме вредных производств). Размер коэффициента к базовой ставке арендной платы равен 2,5. **Начальная цена**: 174, 79 бел. руб. **Задаток:** 17,48 бел. руб.

**Лот № 2**. Право заключения договора аренды сроком на 5 лет помещения площадью 32,0 (19,4; 12,6) кв. м, расположенного на 2-м этаже капитального строения с инв. № 200/С-53951 (отделение связи № 26) по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Советская, 13, для размещения офисов, складских помещений, оказания услуг, организации производства (кроме вредных производств). Размер коэффициента к базовой ставке арендной платы равен 2,5. **Начальная цена**: 128,88 бел. руб. **Задаток:** 12,89 бел. руб.

**Лот № 3**. Право заключения договора аренды сроком на 5 лет помещения площадью 19,6 кв. м, расположенного на 2-м этаже капитального строения с инв. № 240/С-53951 (отделение почтовой связи № 9) по адресу: Витебская обл., Оршанский р-н, г. Орша, ул. Ивана Флерова, 6А для размещения офиса, складского помещения, оказания услуг, организации производства (кроме вредных производств). Размер коэффициента к базовой ставке арендной платы равен 3,0. **Начальная цена**: 78,94 бел. руб. **Задаток:** 7,89 бел. руб.

**Дата, время и место проведения аукциона:** 29.03.2019 в 15.00 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». **Срок внесения задатка и подачи документов:** с 26.02.2019 с 8.30. по 28.03.2019 до 17.30. Сумма задатка перечисляется на р/с организатора аукциона: № BY93MTBK30120001093300066782 ЗАО «МТБанк» г. Минск, БИК MTBKBY22, УНП 390477566. Получатель платежа: ККУП «Витебский областной центр маркетинга»

**Заявления на участие в аукционах со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга».** Аукцион проводится в порядке, установленном Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 № 1049. Юридические, физические лица, индивидуальные предприниматели обязаны подать организатору аукциона в указанный в извещении срок заявление на участие в аукционе, подписать соглашение установленной формы, представить: копию платежного документа о перечислении задатка на расчетный счет организатора аукциона; юр. лицом – резидентом РБ: копию документа, подтверждающую гос. регистрацию юр. лица; юр. лицом – нерезидентом РБ: легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; индивидуальным предпринимателем: копию документа, подтверждающего гос. регистрацию индивидуального предпринимателя. При подаче заявления на участие в аукционе предъявляется документ, удостоверяющий личность; представителями – оригинал доверенности (документ, подтверждающий полномочия должностного лица). Победитель аукциона – лицо, предложившее самую высокую цену. Победитель аукциона (лицо, приравненное к Победителю аукциона) обязан оплатить предмет аукциона, затраты на организацию и проведение аукциона в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона; заключить договор аренды недвижимого имущества не позднее 10 рабочих дней со дня проведения аукциона. В случаях, если Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) не подписал протокол аукциона; не уплатил сумму, по которой продан предмет аукциона; не возместил организатору аукциона сумму затрат на организацию и проведение аукциона; не подписал договор аренды, а также в случае если участники аукциона, отказались объявить свою цену за предмет аукциона, в результате чего аукцион признан нерезультативным, указанными лицами уплачивается штраф в размере 100 базовых величин. Конт. тел.: (0212) 24-63-14, e-mail: vcm74@mail.ru, www.marketvit.by.

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Продавец: ОДО «ТАЯ», 211322, Витебская обл., Витебский р-н, Бабиничский с/с, аг. Бабиничи, ул. Советская, 22, (029) 590-75-08.

Организатор торгов: государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел. (0212) 24-63-14.

**Лот № 1.** Капитальное строение с инв. № 200/С-97621, расположенное по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Бабиничский с/с, аг. Бабиничи, ул. Советская, 22, площадью – 119,5 кв. м, назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – магазин. Капитальное строение расположено на земельном участке с кадастровым номером 221280601101000403, площадью 0,0472 га (право постоянного пользования). Начальная цена: 74 972,76 бел. руб. с НДС. Задаток: 7 497,28 бел. руб. Шаг аукциона – 3 748,64 бел. руб.

Торги в форме открытого аукциона состоятся 29.03.2019 в 09.00 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Заявления для участия в торгах принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5. Срок внесения задатков, приема заявлений и прилагаемых документов на участие в аукционе: с 26.02.2019 с 08.30 по 28.03.2019 до 17.30. Сумма задатка перечисляется на р/с организатора аукциона: № BY93MTBK30120001093300066782 ЗАО «МТБанк» г. Минск, БИК MTBKBY22, УНП 390477566. Получатель платежа: ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Аукцион проводится в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16. Лицо, желающее участвовать в торгах, обязано подать организатору торгов в указанный срок заявление на участие в торгах, документ о внесении задатка на р/с, указанный в извещении, с отметкой банка, представить: юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь – копии устава (учредительного договора – для коммерческой организации, действующей только на основании учредительного договора), имеющего штамп, свидетельствующий о проведении государственной регистрации, и свидетельства о государственной регистрации и их подлинники для заверения копий организатором аукциона, доверенность представителю юридического лица (если юридическое лицо представляет не руководитель) или документ, подтверждающий полномочия руководителя юридического лица (приказ о назначении на должность руководителя, или заверенная выписка из решения общего собрания, правления либо иного органа управления юридического лица в соответствии с учредительными документами, или трудовой договор (контракт), или соответствующий гражданско-правовой договор либо иные документы в соответствии с законодательством); юридическим лицом, иной организацией – нерезидентом Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до даты подачи заявления) или иное равнозначное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык, легализованная в установленном порядке доверенность представителю юридического лица, иной организации или другие легализованные в установленном порядке документы с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык; индивидуальным предпринимателем – резидентом Республики Беларусь – копия свидетельства о государственной регистрации и подлинник для заверения копии организатором аукциона; индивидуальным предпринимателем – нерезидентом Республики Беларусь – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык; представителем гражданина Республики Беларусь, индивидуального предпринимателя – резидента Республики Беларусь – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного физического лица, индивидуального предпринимателя – нерезидента Республики Беларусь – легализованная в установленном порядке доверенность с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык. Протокол о результатах торгов подписывается в день проведения торгов. В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, либо для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается при согласии этого участника по начальной цене, увеличенной на 5 %. Победитель торгов (единственный участник торгов) обязан: оплатить предмет торгов в течение 5 банковских дней со дня проведения аукциона, подписать договор купли-продажи в день проведения торгов, возместить затраты на организацию и проведение торгов, затраты по оценке имущества в течение 5 дней со дня проведения торгов. С предметом торгов можно ознакомиться в рабочие дни с 8.30 до 17.00, тел.: 8 (0212) 24-63-14, 8 (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru; www.marketvit.by.

## ОТЧЕТ местного фонда «Поддержка тенниса» (далее – Фонд) об использовании своего имущества за 2018 год

Утвержден протоколом Правления Фонда от 4 февраля 2019 № 02

| № п/п | Сведения, обязательные для включения в состав отчета | Информация Фонда |
|---|---|---|
| 1 | Информация о количестве учредителей Фонда | 1. Республиканское общественное объединение «Белорусская теннисная федерация» |
| 2 | Информация о стоимости имущества Фонда | В отчетном периоде:<br>2.1. передано учредителем – 0,00 бел. руб.;<br>2.3. поступления от проводимых в соответствии с уставом Фонда мероприятий – 0,00 бел. руб.;<br>2.4. доходы, полученные от осуществления в соответствии с уставом Фонда предпринимательской деятельности, – 0,00 бел. руб.;<br>2.5. иные, не запрещенные законодательством Республики Беларусь поступления, – 737 103,66 бел. руб. |
| 3 | Информация об общей сумме расходов, понесенных фондом на достижение общественно полезных целей, указанных в его уставе | В отчетном периоде общая сумма расходов, понесенных Фондом на достижение общественно полезных целей, указанных в уставе Фонда, – 761 917,93 бел. руб. |
| 4 | Информация о количестве унитарных предприятий, хозяйственных обществ, созданных Фондом для осуществления предпринимательской деятельности, в том числе об участии Фонда в таких юридических лицах | Фонд не является учредителем унитарных предприятий, участником в иных хозяйственных обществах, юридических лицах и коммерческих организациях |

УНП 194905378

## Открытое акционерное общество «Стройдетали». Месторасположение: Минская обл., г. Вилейка, ул. Стахановская, д. 134 извещает о проведении 27 марта 2019 года очередного собрания акционеров общества по адресу: г. Вилейка, ул. Стахановская, 134 (помещение столовой)

Повестка дня:

1. Итоги финансово-хозяйственной деятельности общества за 2018год и основные направления развития в 2019 году.
2. Утверждение акта аудиторской проверки деятельности общества за 2018 год.
3. Утверждение акта ревизионной комиссии по результатам проверки деятельности общества за 2018 год.
4. Утверждение годового отчета, бухгалтерской отчетности за 2018 год.
5. Утверждение использования чистой прибыли за 2018 год.
6. Утверждение размера дивидендов за 2018 год и сроков выплаты дивидендов.
7. Избрание членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии.
8. Утверждение размера вознаграждения членам наблюдательного совета и ревизионной комиссии. .

Начало собрания в 16.00.

Время регистрации с 15 00 до 15.50.

Для регистрации акционерам иметь при себе паспорт, представителям акционеров – паспорт и доверенность. С информацией о деятельности общества можно ознакомиться в отделе экономики начиная с 1 марта 2019.

Наблюдательным советом ОАО «Стройдетали» ( протокол № 32 от 25.02.2019 года) принято решение о формировании реестра владельцев ценных бумаг по состоянию на 18.03.2019 года.

Справки по тел.: (8 01771) 2-25-01, 2-25-10.

УНП 600246748

## ОАО «СТРОЙТРЕСТ № 7» СООБЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ОЧЕРЕДНОГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ

Собрание состоится 29 марта 2019 года в здании администрации ОАО «Стройтрест № 7» (г. Минск, пр-т Машерова, 16, зал заседаний) в 15.00 Регистрация участников собрания – с 14.00 до 14.45 по месту проведения собрания

ПОВЕСТКА ДНЯ:

1. Об итогах деятельности Общества за 2018 год и утверждение годового отчета, бухгалтерского баланса, отчета о прибылях и убытках Общества.
2. Распределение прибыли и убытков по итогам работы Общества за 2018 год с учетом заключения ревизионной комиссии.
3. О размере и сроках выплаты дивидендов по результатам 2018 года.
4. О внесении изменений в Устав Общества.
5. Избрание членов совета директоров и ревизионной комиссии.

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться с 8 марта 2019 г. по 28 марта 2019 г. (в рабочие дни) по месту нахождения общества (пр-т Машерова, 16, тел.: 288-14-49, 284-30-75). Список акционеров для регистрации будет определен по состоянию на 1 марта 2019 г.

Для регистрации иметь при себе следующие документы:

акционеру общества – паспорт;

представителю акционера – паспорт и доверенность.

Совет директоров ОАО «Стройтрест № 7».

УНП 100512859

## ОБЪЯВЛЕНИЕ ОАО «БЕЛФА» г. ЖЛОБИН ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ 26 марта 2019 г. ГОДОВОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ

ПОВЕСТКА ДНЯ:

1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2018 год и основных направлениях деятельности Общества на 2019 год.
2. Отчет о работе наблюдательного совета за 2018 год.
3. О результатах проверки финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2018 год.
4. Утверждение годового отчета: бухгалтерского баланса и приложений к нему за 2018 год.
5. Об источнике покрытия убытков Общества за 2018 г.
6. Утверждение направлений использования прибыли, остающейся в распоряжении предприятия (после уплаты налогов, сборов (пошлин), других обязательных платежей) на 2019 год и первый квартал 2020 года.
7. О внесении изменений в Устав Общества.
8. Утверждение положения о наблюдательном совете.
9. Избрание членов наблюдательного совета Общества и ревизионной комиссии.
10. О размерах вознаграждения членам наблюдательного совета и ревизионной комиссии Общества.

Собрание состоится в актовом зале административно-бытового корпуса (2-й этаж) Общества по адресу:

Проезд Красный, 2, г. Жлобин, Гомельская область.

Начало в 10.00.

Регистрация участников собрания с 8.00 до 09.45.

Для регистрации при себе иметь следующие документы:

акционеру Общества – паспорт;

представителю акционера – паспорт и доверенность.

Список лиц, имеющих право на участие в общем собрании, составляется на основании данных реестра владельцев акций по состоянию на 1 марта 2019 года.

С материалами по проведению собрания можно ознакомиться по месту нахождения Общества с 15 марта 2019 года.

Наблюдательный совет.

УНП 400076540

## РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Строительный трест № 21», находящегося в г. Борисов, ул. Чапаева, 82

**Лот № 1.** Административное помещение, инв. № 610/D-54569. Площадь – 932,9 кв. м. Г. п. – 1983. **Начальная цена – 470 160,46 бел. руб. с НДС. Задаток – 47 016,05 бел. руб.**

**Лот № 2.** Административное помещение, инв. № 610/D-54571. Площадь – 936,3 кв. м. Г. п. – 1983. **Начальная цена – 471 874,00 бел. руб. с НДС. Задаток – 47 187,40 бел. руб.**

**Условия аукциона:** 1. Подписать с Продавцом договор купли-продажи в течение 10 (десяти) рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.
2. Условия оплаты приобретенного на аукционе Лота (Лотов) согласовываются Победителем аукциона (Претендентом на покупку) и Продавцом при подписании договора купли-продажи.
3. Оплатить Организатору аукциона вознаграждение в течение 3 (трех) банковских дней со дня подписания протокола о результатах аукциона в размере 1 % от цены продажи лота.
4. На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством для Победителя аукциона

**Аукцион состоится 29.03.2019 в 14.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4. Шаг аукциона – 5 %**

Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора аукциона ino.by.

Продавец: ОАО «Строительный трест № 21», г. Борисов, ул. Чапаева, д. 82, тел. 8 (0177) 73-10-14. Организатор аукциона: РУП «Институт недвижимости и оценки», 220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9.

Задаток перечисляется на р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, 220004, ул. Кальварийская, д. 4а, BIC банка BPSBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Строительный трест № 21» (Лот №__), проводимом 29.03.2019 г. Лица, желающие участвовать в торгах по нескольким Лотам, вносят задаток, установленный для каждого из Лотов. Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 7. Окончание приема заявлений – 27.03.2019 в 11.00. Контактное лицо для осмотра Объектов – Латушкин Александр Иванович, тел. 8 (029) 158-58-34

**Организатор аукциона: 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

## РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего ООО «БЕЛГАЗНАЛАДКА»

**Лот № 1.** Здание инженерно-лабораторного корпуса (литер А 4/к-кп), инв. № 500/С-28176. Площадь – 3078 кв. м. Адрес: г. Минск, ул. Гурского, 32. **Начальная цена** с НДС – 3 512 000,00 бел. руб. **Задаток** – 351 200,00 бел. руб. **Шаг аукциона** – 5 %. **Обременение** – аренда (перечень сдаваемых в аренду площадей содержится на сайте Организатора аукциона ino.by).

Земельный участок: кадастровый номер 500000000005001607, площадь 0,2998 га. Право постоянного пользования. Переход права осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь. Список обременений на земельный участок на сайте Организатора аукциона ino.by.

**Условия аукциона:** 1. Подписать с Продавцом договор купли-продажи не позднее 5 (пяти) рабочих дней с назначенной даты проведения аукциона.
2. Условия оплаты приобретенного на аукционе Лота согласовываются Победителем аукциона (Претендентом на покупку) и Продавцом при подписании договора купли-продажи.
3. Победитель аукциона (Претендент на покупку) в случае заинтересованности в земельном участке с кадастровым номером 500000000005001608 площадью 0,0869 га вправе обратиться в Мингорисполком для заключения договора аренды.
4. Оплатить Организатору аукциона вознаграждение в размере 1 % от цены продажи Лота № 1 в течение 3 (трех) банковских дней со дня подписания протокола о результатах аукциона

**Аукцион состоится 29.03.2019 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4**

Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора аукциона ino.by.

Продавец: ООО «БЕЛГАЗНАЛАДКА», г. Минск, ул. Гурского, д. 32, тел. 8 (017) 356-16-13.

Организатор аукциона: РУП «Институт недвижимости и оценки», 220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 4, тел. 8(017) 324-70-57.

Задаток перечисляется на р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, 220004, ул. Кальварийская, д. 4а, BIC банка BPSBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже Лота №1, принадлежащего ООО «БЕЛГАЗНАЛАДКА», проводимом **29.03.2019** г. Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 7. Окончание приема заявлений **27.03.2019** в 11.00. Контактное лицо для осмотра Объекта – Марочкина Ольга Анатольевна, тел. 8 (044) 537-38-40

**Организатор аукциона: 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

## Торговое унитарное предприятие «Зернопродукты» извещает о проведении открытого аукциона по продаже недвижимого имущества

Лот № 1: капитальное строение с инв. № 110/С-1234, адрес: Брестская обл., г. Барановичи, пер. Советский 3-й, 7, площадь 107,7 кв. м, целевое назначение – здание административное, наименование – административное здание. Начальная цена продажи с НДС 20 % – 180 000,00 руб. Сумма задатка – 18 000,00 руб. Лот № 1 расположен на земельном участке с кадастровым номером 141000000005003675 площадью 0,0150 га, целевое назначение – для обслуживания административного здания. Земельный участок имеет ограничения прав в использовании земли.

Характеристики лота 1: год постройки – до 1939; фундамент – кирпич; стены и перегородки – кирпич; перекрытия – железобет. Плиты, деревянные; кровля – шифер; полы – плиточные; окна – стеклопакеты; двери – металлопластик, пластик, дерево; отделка внутр. – оштукатурено, покрашено, оклеено обоями, облицовано плиткой; электричество, водопровод, канализация, газоснабжение.

Аукцион по продаже лота 1 состоится 27.03.2019 в 14.00. Заявления на участие в аукционе принимаются не позднее 16.00 26.03.2019.

Продавец и организатор аукциона – торговое унитарное предприятие «Зернопродукты», Брестская обл., г. Барановичи, пер. Советский 3-й, д. 7, тел./факс 8 (0163) 65-20-71. Место проведения аукционов: Брестская обл., г. Барановичи, пер.Советский 3-й, д 7.

Порядок оформления участия в аукционе и его проведения определяется Гражданским кодексом Республики Беларусь, Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов недвижимости, находящихся в собственности торгового унитарного предприятия «Зернопродукты».

Задаток в размере 10 % от начальной стоимости соответствующего лота перечисляется организатору аукциона на р/с BY33AKBB30126031000141300000BYN в филиале 802 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Барановичи, BIC: AKBBBY21802, УНП 290275339, получатель платежа – торговое унитарное предприятие «Зернопродукты». Срок внесения задатка – до подачи заявления на участие в аукционе. Шаг аукциона: 1 % от начальной цены предмета аукциона.

Заявления на участие в аукционе и необходимые документы, в том числе документы, подтверждающие оплату задатка, принимаются по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, пер. Советский 3-й, д. 7 (бухгалтерия) в рабочие дни с 08.30 до 16.30.

Победитель аукциона (единственный участник аукциона) обязан в течение 3 рабочих дней с даты проведения аукциона оплатить организатору аукциона сумму в счет возмещения фактических затрат на организацию и проведение аукциона. Информация о размере затрат доводится до сведения участников перед началом аукциона.

Договор купли-продажи с победителем аукциона (единственным участником аукциона) заключается в течение 30 календарных дней с даты проведения аукциона и подписания протокола о результатах аукциона. Условие оплаты – в течение 5 рабочих дней с момента подписания договора. По соглашению сторон возможно предоставление рассрочки оплаты.

Памяць

# «БЕЛАРУСЫ — САМЫ АНТЫНАЦЫСЦКІ НАРОД...»

**Здаецца, ужо прайшло шмат часу пасля завяршэння Вялікай Айчыннай вайны, але жывуць успаміны, якія не даваляюць прапускаць памятныя даты. Чаму пра падзеі, якія адбываліся больш за паўстагоддзя таму, трэба гаварыць і сёння? І шукаць тое, што пакуль не прамоўлена, у архівах, сярод стосаў папер і фотаздымкаў...**

На базе Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь у межах праграмы XXVI Мінскай міжнароднай кніжнай выстаўкі-кірмашу ўдзельнікі круглага стала, прысвечанага 75-годдзю вызвалення Беларусі ад нацысцкіх захопнікаў, абмеркавалі актуальныя пытанні захавання памяці і гістарычнай праўды народа аб гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Гаворка ішла ў тым ліку пра неабходнасць новых выданняў па гэтай тэме.

**Аляксандр КАВАЛЕНЯ, акадэмік-сакратар Аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, член-карэспандэнт НАН Беларусі, доктар гістарычных навук, прафесар:**

— Сёння мы адчуваем, што павінны займацца навукова-папулярнай літаратурай — час патрабуе. Існуе шмат людзей і арганізацый, якія імкнуцца размыць нацыянальную памяць беларусаў. Наша асноўная задача — выхоўваць праз гістарычную памяць маладое пакаленне. Лозунгамі не выхоўваюць — выхоўваюць сур'ёзным удзелам і прыкладам. Трэба падумаць, як зацікавіць чытача, якім чынам падаць той ці іншы матэрыял, каб гэта чапляла душу. Гаворачы пра падзеі Вялікай Айчыннай вайны, мы не павінны забываць людзей, на чыіх плячах стваралася сапраўдная героіка народа. Нам трэба помніць пра гэтую повязь пакаленняў і эпох.

**Ігар МАРЗАЛЮК, старшыня камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, культуры і навуцы, член-карэспандэнт Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, доктар гістарычных навук, прафесар:**

— Беларускі народ — гэта адзіны народ ва Усходне-Цэнтральнай Еўропе, для якога слова «вайна» — падзеі 1941—1945 гадоў — на ўзроўні геннай памяці. Ва ўсіх цывілізаваных краінах ёсць гістарычная палітыка і ёсць абсалютна акрэсленыя месцы гістарычнай памяці, якія з'яўляюцца знакавымі з'явамі. Скажу пра заканадаўства Федэратыўнай Рэспублікі Германія, дзе пытанні гістарычнай памяці вельмі жорстка кантралююцца — і фальсіфікацыі, хлусня не абвяшчаюцца свабодай слова, асабліва што звязана з адмаўленнем фактаў злачынстваў і выкарыстаннем нацысцкай сімволікі. Я з задавальненнем пераклаў бы на беларускую і рускую мовы закон ФРГ і ўзаконіў бы тут. Ёсць рэчы, якія ў прыстойным грамадстве рабіць нельга. Ніякай палітычнай мэтазгоднасцю і высокімі ідэямі злачынствы супраць чалавецтва не апраўдваюцца.

За што ваявалі беларусы? Сёння вельмі папулярная наскрозь ілжывая ідэя, якая сцвярджае, што нашы продкі сталі ахвярамі паміж молатам і кавадлам, і нібыта нічога не разумелі. Нядаўна прачытаў, што «на першай фазе вайны 98 % беларусаў падтрымлівалі немцаў і толькі 2 % змагаліся за сталінскі рэжым». Але чым была вайна з самага пачатку? Гэта чарговы разрыў адзінай тэрыторыі, гэта акупацыя розных частак па-рознаму, гэта пацыфікацыйныя дзеянні на Палессі з боку ўкраінскіх нацыяналістаў, не толькі супраць палякаў, гэта этнічныя зачысткі Віцебшчыны, якія праводзіліся латышскімі паліцэйскімі батальёнамі (пра што



публікаваліся звесткі не ў адным зборніку). Пра такія рэчы нельга забываць. Але не для таго, каб памнажаць нянавісць і злобу. Гэта наўпрост праўдзівае адлюстраванне падзей, каб было зразумела, чаму пятнаццацігадовыя хлопцы бралі ў рукі зброю. Вельмі часта кажуць, што не было ніякага беларускага партызанскага руху, не было беларускай суб'ектнасці ў гэтым. Некаторыя сцвярджаюць, што змаганне было за нейкія сусветныя ідэалы і савецкую радзіму. Так, але вобраз Беларусі як рэспублікі быў суб'ектаваны. Некаторыя ўвогуле лічаць, што ўсе партызаны былі бандытамі. Безумоўна, былі крымінальнікі са зброяй у руках, якія рабавалі ўсіх. Але ж калі гэта выстаўляецца ў найлепшых традыцыях гебельсаўскай прапаганды — гэта абраза і знявага тых людзей, якія сапраўды змагаліся з ворагам. Гэта плявок у твар Янку Брылю, Алесю Адамовічу, Васілю Быкаву. Цікавы момант, на які звычайна не звяртаюць увагу: беларусы — самы антынацысцкі народ Усходне-Цэнтральнай Еўропы. Колькасць калабарацыяністаў, здраднікаў і тых, хто супрацоўнічаў з нацыстамі, у нас найменшая з усіх астатніх еўрапейскіх краін. Калі гісторык, ці публіцыст, ці журналіст памнажае эскалацыю нянавісці, то ён нясе адказнасць у разы большую. Для таго, каб хтосьці пайшоў забіваць, патрэбна стварыць вобраз ворага.

**Аляксей ЛІТВІН, загадчык аддзела ваеннай гісторыі Беларусі Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, доктар гістарычных навук, прафесар:**

— Трэба ведаць праўду пра кожную падзею ў дэталях. Нельга прапаведаваць глыбокія філасофскія ідэі, калі мы — гісторыкі — не разабраліся ў фактах. Бо наша задача — знайсці праўду. Нас паважаюць толькі тады, калі можам прадставіць нейкую фактуру і версіі, якія можа быць колькі заўгодна. Напрыклад, мы кажам: «Беларусь-партызанка», а што за гэтым? Чаму ў нас партызанская барацьба была законная? Савецкі Саюз не склаў зброю, як некаторыя краіны. Усім, хто крытыкуе партызанскія дзеянні, раю пачытаць нямецкія дакументы.

Павінна быць некалькі ўзроўняў — глыбокае гістарычнае даследаванне, папулярызацыя гісторыі, і ўсё гэта мае быць падтрымана дзяржаўнай праграмай. У гэтай сувязі мне бачыцца вялікім крокам перавыданне серыі кніг «Памяць», бо гэта будзе новы ўзровень.

**Уладзімір АНДРЫЕВІЧ, дырэктар выдавецтва «Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі»:**

— З улікам сучасных тэхналогій, кліпавасці падачы інфармацыі, візуальнага ўспрымання работа выдавецтва павінна таксама мяняцца. У нашых планах — адметнае сучаснае выданне «Энцыклапедыі спаленых вёсак Беларусі». Магчымасці ёсць: мы маем досвед, і трэба спрабаваць, трэба рызыкаваць, трэба ісці наперад. Другі праект, што плануецца, — ілюстраваная энцыклапедыя «Партызаны Беларусі». Здавалася б — шмат напісана, паказана і расказана. Але побач з героікай існавала цэласнае жыццё партызанскага руху на тэрыторыі Беларусі. Можна было б звярнуцца да серыі «Памяць» — выдаць яе ў электронным варыянце. Таксама мяркуем выдаць кнігу пра канцлагер у Масюкоўшчыне.

У Беларусі не да канца ўсвядомілі ўрокі вайны, таму серыя «Беларусь. Трагедыя і праўда памяці» будзе працягвацца. Мы бяром на сябе функцыю «лакаматыва», будзем выдаваць кнігі на дзвюх ці трох мовах, каб беларускую пазіцыю ўспрынялі і за межамі нашай краіны.

...Насамрэч, чытацкі запыт ёсць, такія кнігі выклікаюць эмоцыі, асабліва ў моладзі, сцвярджаюць гісторыкі. Успомніць хоць бы кнігі «З верай у перамогу. Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне» ці «Боль і гнеў. Халакост і Супраціўленне ў Навагрудку», што прэзентавалі сёлета на выстаўцы. У розныя перыяды да апісання вайны падыходзілі па-рознаму. Новыя архівы могуць нарадзіць новыя погляды. Але беларускія вучоныя запэўніваюць: нават пры новых канцэпцыях не адкідваецца тое, што ўжо было напрацавана.

**Яўгенія ШЫЦЬКА.**

# НАРОДНЫЯ САКРАТАРЫ, НАРКАМЫ, МІНІСТРЫ...

**У год, калі ўрачыста адзначаецца 100-годдзе МЗС Беларусі, — варта ўспомніць тых, хто на працягу гэтага веку стаяў на пярэднім краі нашай знешняй палітыкі, абараняючы інтарэсы Беларусі. Гэта былі розныя па сацыяльным паходжанні, веравызнанні, веры, адукацыі, ідэалагічных поглядах людзі, але ўсіх іх яднала адно — любоў да Радзімы і свайго народа, сапраўдны патрыятызм. У залежнасці ад гістарычных абставін яны называліся народнымі сакратарамі, наркамамі, міністрамі, што не ўплывала на галоўную мэту іх дзейнасці — адстойванне інтарэсаў сваёй Айчыны.**

Нельга тут не згадаць Язэпа Варонку і Рамана Скірмунта — першых народных сакратароў замежных спраў і адначасова старшынь Народнага Сакратарыята (урада) БНР, якія ў 1918 годзе рабілі першыя крокі па прызнанні права беларусаў на самавызначэнне. Іх пераемнік на гэтых пасадах Іван Серада ў больш позні часы працаваў у Інбелкульце БССР. Антон Луцкевіч, адзін са стваральнікаў беларускага нацыянальнага руху, быў ужо міністрам замежных спраў і прэм'ер-міністрам БНР. Яго наступнік на пасадзе Вацлаў Ластоўскі — вядомы дзеяч асветніцтва і беларускасці ўжо ў савецкай рэспубліцы. Нельга не згадаць і аднаго з апошніх міністраў замежных спраў (з 1921-га па 1925 год) і прэм'ер-міністраў БНР Аляксандра Цвікевіча, які правёў у кастрычніку 1925 года ў Берліне Беларускую нацыянальную палітычную канферэнцыю, якая абвясціла, што адзіным цэнтрам адраджэння Беларусі з'яўляецца савецкі Мінск, а ўрад БНР і Рада Рэспублікі павінны скласці свае паўнамоцтвы. Вельмі важна адзначыць, што з усіх эміграцкіх урадаў той пары толькі беларусы змаглі пераадолець пачуцці класавай варожасці і прадэманстраваць сапраўднае імкненне да нацыянальнай кансалідацыі і стварэння дзяржавы.

Першым народным камісарам Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі Беларусь (ССРБ) стаў Усевалад Фальскі (з 1 студзеня па 8 лютага 1919 года), вядомы артыст і тэатральны дзеяч. Калі ў лютым было прынята рашэнне аб стварэнні новага дзяржаўнага ўтварэння — Літоўска-Беларускай ССР, а Віцебская, Магілёўская і Смаленская губерні былі перададзены РСФСР, Фальскі заявіў рэзкі пратэст і падпісаў разам з сябрамі беларускага ўрада ліст на імя У. Леніна, Я. Свярдлова і І. Сталіна з нязгодай на рашэнне ЦК РКП(б). За гэта быў у лютым 1919 года арыштаваны і да красавіка 1919 года прасядзеў у Мінску і Смаленску ў вязніцах. Пасля вяртання на Радзіму высланы ва Украіну, дзе працаваў дырэктарам тэатра.

Пасля вызвалення тэрыторыі Беларусі ад палякаў і аднаўлення БССР народным камісарам замежных спраў (з 1920-га па ліпень 1923 года) стаў старшыня СНК Аляксандр Чарвякоў. Таленавітага палітычнага і дзяржаўнага дзеяча і дыпламата, які рабіў усё магчымае па недапушчэнні прыняцця Рыжскага дагавора ад 18 сакавіка 1921 года ў рэдакцыі, непрымальнай для нашай краіны. Калі яго не ўключылі ў склад дэлегацыі на перагаворах, ён паехаў туды фактычна інкогніта.

Пасля стварэння СССР НКЗС БССР быў ліквідаваны і яго функцыі перадаваліся адпаведнаму саюзнаму наркамату. Але цэнтр не мог ігнараваць многія міжнародныя аспекты жыцця нашай рэспублікі. З гэтай нагоды быў уведзены інстытут упаўнаважанага Народнага камісарыята замежных спраў СССР у БССР. Самым вядомым упаўнаважаным НКЗС СССР у БССР быў Аляксандр Ульянаў, у будучыні — саветнік пасольства СССР у Польшчы і Балгарыі. Менавіта ён адыграў вырашальную ролю ў самароспуску ўрада БНР на так званай Берлінскай канферэнцыі ў 1925 годзе.

Ва ўмовах завяршэння Вялікай Айчыннай вайны было прынята рашэнне аб аднаўленні Камісарыята замежных спраў БССР, які пачаў працаваць у толькі што вызваленым Гомелі. Больш за дваццаць гадоў функцыі народнага камісара замежных спраў БССР (з 30 сакавіка 1944-га па 15 сакавіка 1946 года) і міністра замежных спраў (з 15 сакавіка 1946-га па 14 мая 1966 года) бліскуча выконваў Кузьма Кісялёў. Ён назаўсёды ўвайшоў у гісторыю беларускай дыпламатыі, падпісаўшы разам з Ф. Шмыгавым, У. Перцавым, А. Жэбракам і Г. Байдаковым Статут ААН. Дзякуючы яго намаганням БССР афармліла сваё членства практычна ва ўсіх спецыялізаваных міжнародных арганізацыях (Арганізацыя Аб'яднаных Нацый па пытаннях навукі, культуры і асветы, Сусветная арганізацыя аховы здароўя, Міжнароднае агенцтва па атамнай энергетыцы і г. д.), а таксама падпісала шэраг шматбаковых міжнародных дагавораў, пагадненняў, канвенцый, пратаколаў.

Яго намаганні па ператварэнні БССР у рэальна дзеючага суб'екта міжнароднага права, пашырэнні міжнароднага прэстыжу нашай краіны паспяхова працягваў Анатоль Гурыновіч, які кіраваў нашым ведамствам амаль чвэрць стагоддзя — з 1966-га па 1990 год. Заступіўшы на пасаду пасля яго, не мог з пачуццём удзячнасці не ацаніць той «падмурак» сяброўскіх кантактаў і сувязяў на міжнароднай арэне і асабліва ў ААН, якія ён пакінуў нам. І калі ў кастрычніку 1990 года ў наша прадстаўніцтва ў Нью-Ёрку на дыпламатычны ланч прыйшоў Генеральны сакратар ААН Перэс дэ Куэльяр, з якім Анатоль Гурыновіч асабіста сябраваў, стала зразумела, якой павагай ён карыстаўся сярод дыпламатычнай эліты свету нават пасля завяршэння сваёй кар'еры.

Народныя сакратары, наркамы, міністры... Іх барацьба, жыццёвы шлях, унёсак у стварэнне Беларускай Дзяржавы — неацэнныя. Выхадцы з сялянскага асяроддзя і з заможнай шляхты, праваслаўныя і рымакаталікі, уніяты і іўдзеі, бальшавікі і эсэры, меншавікі і хадэкі. Іх яднае адно — любоў да Бацькаўшчыны, барацьба за найвялікшую каштоўнасць — яе Незалежнасць. Яны ішлі да яе рознымі шляхамі, абапіраючыся на розных саюзнікаў, але мэта ва ўсіх была адна.

**Пётр КРАЎЧАНКА,**
**міністр замежных спраў БССР і Рэспублікі Беларусь (1990—1994 гады).**

# АГУЛЬНАЯ СПРАВА

## Зялёны — колер дабрабыту

**Як зрабіць беларускія тэрыторыі больш чыстымі і экалагічна бяспечнымі, абмеркавалі ўдзельнікі калегіі Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя.**

### НАВЯДЗЁМ ПАРАДАК РАЗАМ

— У плане навядзення парадку на зямлі мы нарэшце адарваліся ад сухіх лічбаў, гэта праца стала жывой, набыла характар рэальнага ўзаемадзеяння з суб'ектамі гаспадарання, — адзначыў **міністр прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Андрэй ХУДЫК.** — Але пакуль сказаць, што паўсюль наведзены ідэальны парадак, нельга.

Міністр упэўнены: сёлета неабходна працягваць кампанію «Добраўпарадкуем малую радзіму», задзейнічаць яшчэ больш людзей і рэсурсаў. А стымулам для актыўных дзеянняў павінна стаць увядзенне рэйтынга экалагічнага развіцця рэгіёнаў, які будзе адлюстроўваць намаганні мясцовых органаў улады па забеспячэнні спрыяльнага наваколля і высокай якасці жыцця насельніцтва.

### СТРАТЭГІЧНЫЯ РЭСУРСЫ

У мінулым годзе запасы нафты прыраслі на 638 тыс. тон, ці 106,3% ад устаноўленага паказчыка. Акрамя таго, быў забяспечаны прырост прамысловых запасаў некаторых відаў пяску, пясчана-гравійнай сумесі, торфу, трэпелу, гліны.

Праблемнымі, паводле слоў **намесніка міністра Андрэя ХМЕЛЯ,** застаюцца пытанні ўцягвання ў эканоміку такіх карысных выкапняў, як падземныя воды і сыравіна для будаўнічай галіны. Неабходна павысіць экспарт беларускіх падземных вод — як прэсных, так і мінеральных — і актыўна ўцягваць у абарот мясцовую сыравіну для будаўнічай галіны, каб скараціць яе ўвоз з іншых краін.

### ЯКІ ПРАГНОЗ?

2018 год праходзіў пад знакам мадэрнізацыі дзейнасці гідраметэаралагічнай службы краіны. Прынятыя меры паспрыялі павышэнню апраўдвальнасці прагнозаў надвор'я. Сёння на наступныя суткі яна складае 97,1 % (у 2017 г. — 96,3 %), на трое сутак — 97 % (у 2017 г. — 96,2 %). З 36 да 59 гадзін узрасла і своечасовасць папярэджанняў аб неспрыяльных і небяспечных метэаралагічных з'явах.

### ВІДЫ: КАШТОЎНЫЯ І ШКОДНЫЯ

Для захавання папуляцыі еўрапейскага вугра адобраны праект «Распрацаваць комплекс мерапрыемстваў, накіраваных на падтрыманне ўстойлівага стану еўрапейскага вугра на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь». Па словах Андрэя Худыка, сёння неабходна працягнуць работу для зняцця забароны на продаж лічынак гэтай рыбы, якая ўведзена ў краінах Еўрапейскага саюза.

Адзін з асноўных ворагаў сярод інвазійных раслін — баршчэўнік Сасноўскага — хоць і здае свае пазіцыі, але не паўсюль. Пакуль што знізіць колькасць месцаў яго росту не атрымліваецца ў Віцебскай і Мінскай абласцях. Акрамя Магілёўскай вобласці і Мінска, у другіх рэгіёнах краіны вырасла плошча, якую займае сумнік канадскі, а ў Гродзенскай — эхінацыстыс шыпаваты.

— Правядзенне мерапрыемстваў па рэгуляванні колькасці інвазійных відаў павінна ісці больш актыўна, — падкрэсліў міністр. Гэта магчыма пры выкарыстанні найбольш эфектыўнага хімічнага ці камбінаванага спосаба знішчэння раслін, уцягванні ў гаспадарчы абарот земляў, якія не выкарыстоўваюцца.

### ЯК АЧЫСЦІЦЬ ВАДУ І ПАВЕТРА

У 2018 годзе аб'ём выкідаў забруджвальных рэчываў у атмасфернае паветра ад стацыянарных і мабільных крыніц знізіўся на 5,5 тыс. тон і склаў 1238 тыс. тон. Па словах **першага намесніка міністра Іі МАЛКІНАЙ,** гэтаму паспрыяла правядзенне 177 прыродаахоўных мерапрыемстваў, у тым ліку мадэрнізацыя ачышчальнага абсталявання на некаторых прадпрыемствах краіны. У найбліжэйшыя два гады неабходна таксама ўкараніць аўтаматызаваныя сістэмы кантролю выкідаў і распрацаваць сістэму збору і апрацоўкі такой інфармацыі.

Зніжэнне скіду недастаткова ачышчаных сцёкавых вод у паверхневыя водныя аб'екты — яшчэ адна задача, на рашэнне якой трэба накіраваць значныя рэсурсы, лічыць Андрэй Хмель. У мінулым годзе аб'ём такіх вод скараціўся на 28,6 % да ўзроўню 2015 года і склаў 4,069 млн $м^3$. Нягледзячы на пэўныя поспехі, у краіне застаюцца і праблемныя раёны — Дзяржынскі, Валожынскі, Салігорскі (68,1 % скідаў зафіксавана ў Мінскай вобласці).

— Начальнікам адпаведных інспекцый неабходна звярнуць увагу на гэту праблему і ва ўзаемадзеянні з камунальнымі прадпрыемствамі прыняць неабходныя меры, — падкрэсліў Андрэй Хмель.

### СМЕЦЦЕВАЯ ПРАБЛЕМА

У 2018 годзе ўзровень вымання другасных матэрыяльных рэсурсаў са складу камунальных адходаў склаў 19 % (у 2017 г. — 17 %). Але гэтага, на думку Андрэя Худыка, недастаткова. Тым больш што ў краіне ёсць раёны, напрыклад Смалявіцкі і Салігорскі, дзе гэты паказчык меншы за 10 %.

Міністр расказаў пра выпадкі, калі ў схемах абыходжання з адходамі не была прадугледжана перадача на дасартаванне смецця з кантэйнераў для ДМР і яно вывозілася непасрэдна на палігон. Для паляпшэння вымання ДМР у Мінпрыроды лічаць патрэбным стварацасць магутнасці па сартаванні адходаў у тых раёнах, дзе яны адсутнічаюць; павялічваць загрузку станцый сартавання; устанавіць забарону ў схемах абыходжання з ЦКА вывазу змяшаных адходаў без папярэдняга сартавання.

Акрамя гэтых пытанняў, па словах міністра, неабходна выпрацаваць падыходы па паэтапным замяшчэнні поліэтыленавай тары, у тым ліку вады і напояў, шкляной.

* * *

Асаблівае значэнне мае праца па давядзенні да грамадскасці своечасовай, аб'ектыўнай і прафесійнай інфармацыі аб сітуацыі ў галіне экалагічнай бяспекі, падкрэсліў міністр. І гэта работа на апярэджанне, у якую павінны ўключацца ўсе — ад кіраўнікоў у цэнтральным апараце Мінпрыроды да кожнага інспектара ў раёне.

Падчас калегіі **намеснік прэм'ер-міністра Беларусі Міхаіл РУСЫ** абазначыў ключавыя задачы для Мінпрыроды на 2019 год. Сярод іх — распрацоўка прапаноў па вывадзе з абароту пластыкавай тары; азеляненне і навядзенне парадку на зямлі; вырашэнне праблем, звязаных з абыходжаннем з адходамі, асабліва небяспечнымі; больш якасная прапрацоўка праектаў дакументаў нарматыўна-прававой базы; актывізацыя экспарту паслуг, а таксама праца па захаванні біяразнастайнасці.

**Вераніка КОЛАСАВА.**

---

Чалавек у навакольным асяроддзі

# ЧАМУ САЮЗНІК СТАНОВІЦЦА ВОРАГАМ

## Разважанні пасля наведвання выстаўкі ў Брэсцкім краязнаўчым музеі

**Пачну, мабыць, з нечаканага і не зусім па тэме. Хаця як паглядзець. Нядаўна ў размове са старшынёй Ружанскага пасялковага Савета між іншым прагучала такая думка: маўляў, што жыць бяспечна можна цяпер толькі ў аддаленай вёсцы ў гармоніі з прыродай. І хацелася б паспрачацца, але, калі задумацца, гэта меркаванне ў наш час мае пад сабой усе падставы.**

### Ідэя і тэма

Да падобнай высновы прыходзяць многія ў свеце. Прыходзяць рознымі шляхамі. «Паратунак» ад выгод цывілізацыі, да якіх імкнуўся вякамі, чалавек знаходзіць толькі на ўлонні прыроды, там, дзе стагоддзямі амаль нічога не мянялася. Але як сам чалавек паводзіць сябе з навакольным асяроддзем і што яму за гэта ў рэшце рэшт будзе? Такімі ды іншымі пытаннямі кіраваліся арганізатары выстаўкі пад назвай «Чалавек і прырода — саюзнікі альбо ворагі?».

Назва экспазіцыі хоць і носіць крыху агульны характар, але мае пэўную тэму — барацьба з браканьерствам.

**Загадчыца сектара «Прырода і экалогія» Брэсцкага абласнога краязнаўчага музея Наталля МУРЫГІНА,** аўтар экспазіцыі, выступіла ў ролі гіда для карэспандэнта. Наталля Анатольеўна расказала, што большая частка экспанатаў вернісажу складаецца з браканьерскіх прылад, якія канфіскавалі супрацоўнікі Дзяржінспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету. Рэдкі выпадак, калі пасля завяршэння выстаўкі яе экспанаты будуць знішчаны. Ну, хіба толькі кіраўніцтва музея дамовіцца з кіраўніцтвам інспекцыі, каб нешта з прыкладаў незаконных снасцей пакінулі ў фондах для будучых экспазіцый.


Наталля МУРЫГІНА.

Дык вось, своеасаблівым фонам для гэтай сёлетняй выстаўкі стала двухсотметровая сетка ручной работы, якую канфіскавалі на Прыпяці. Фонам, таму што сетку развесілі ўздоўж сцяны, давялося нават загарнуць яе канцы. Гэта класічная браканьерская снасць патрабуе ўмення і майстэрства ў вырабе. Паплаўкі, зробленыя з бярозавай кары, нечым нагадваюць старажытную грамату — бяросту. У такой сетцы могуць заблытацца некалькі чалавек, не кажучы ўжо пра колькасць рыбы. І гэты экспанат, варта сказаць, уяўляе сабой самае гуманае прыстасаванне для незаконнага промыслу. Тут ёсць заточаныя восці і сачкі, да якіх падведзены самаробныя электрапрыборы. Апошні — вельмі небяспечны інструмент, які губіць усё жывое на сваім шляху. І за яго выкарыстанне прадугледжана крымінальная адказнасць. Ёсць яшчэ капканы, якія нечым нагадваюць сярэднявечныя прылады для катаванняў. Адным словам, прадстаўлены цэлы арсенал сродкаў, якімі чалавек XXI стагоддзя губіць прыроду.

### Формы і праявы браканьерства

Успамінаю рэйд прыкладна гадавой даўніны з супрацоўнікамі Брэсцкай абласной інспекцыі на азёрах Маларыччыны. Дык вось, на Лукаўскім вадасховішчы сярод белага дня трое злосных браканьераў з лодкі цягнулі адну за адной сеткі з вады. Потым падлічылі: сетак было 14 штук агульнай даўжынёй больш за 800 метраў. За крымінальнымі рыбакамі з засады назіралі інспектары і ўбачанае фіксавалі на відэа. Потым былі затрыманы двое грамадзян, жыхары суседніх вёсак, раней судзімыя, за іх незаконным заняткам. У мяшках у іх знаходзілася больш за два дзясяткі рыбін і 561 рак. Паколькі шкода, нанесеная прыродзе, мела асабліва буйны памер, справа скончылася судом.

Кіраўнік раённай арганізацыйнай структуры Маларыцкага таварыства паляўнічых і рыбаловаў расказваў пра яшчэ адзін кірунак у браканьерстве, які можна назваць хіба толькі дадатковым пошукам адрэналіну. Ну, скажам так, багаты чалавек бярэ стрэльбу, ідзе ў лес на паляванне без пуцёўкі. Яму тыя 30 рублёў нічога не значаць, але знарок не бярэ дакумент, ідзе на пэўную рызыку, маўляў, вось я такі, вольны ад законаў. Адным словам, браканьерства мае самыя розныя формы і праявы. Пра гэта і расказвалі супрацоўнікі брэсцкай інспекцыі, калі праводзілі сустрэчу з наведвальнікамі выстаўкі. Напрыклад, прыводзіліся такія лічбы: толькі летась у рэгіёне было выяўлена і спынена 127 парушэнняў правілаў вядзення паляўнічай гаспадаркі і палявання, 342 парушэнні правілаў вядзення рыбалоўнай гаспадаркі і рыбалоўства, канфіскавана 78 адзінак паляўнічай зброі і 40 кіламетраў сетак.

Адным з цікавых раздзелаў гэтага вернісажу можна назваць і выстаўку плакатаў, іншай агітацыйнай прадукцыі розных гадоў. Напрыклад, плакат 60-х гадоў мінулага стагоддзя зроблены ў «вожыкаўскай» стылістыцы: «Калі любіш ты прыроду, браканьерам не дай ходу!», іншыя агіткі, варта сказаць, не менш цікавыя. Ёсць і сучасная прадукцыя, а таксама школьныя газеты. Напрыклад, брэсцкая СШ № 10 выпускае газету «Лесавічок». Дзеці заклікаюць не паддавацца спакусе збіраць першацветы, не знішчаць іх.

### Прапаганда і агітацыя

Чалавек штогод не толькі знішчае кволыя першацветы, ён ссякае дрэвы ў гарадскім асяроддзі, тым самым робячы горад больш безабаронным. І не адны старыя ды аварыйныя дрэвы церпяць. У патэнцыйных забудоўшчыкаў на ўсё заўсёды знаходзяцца дазволы, абгрунтаванні. У музеі раней працавала дазорцам жанчына, якая жыла ў Паўднёвым мікрараёне. Гадоў дваццаць таму названы былі ваенны гарадок нагадваў парк па колькасці зялёных насаджэнняў. Яна расказвала, што старэйшыя жыхары раёна, грамадскія актывісты нават ноччу дзяжурылі, каб не даць ссекчы асобныя дрэвы. Але дзе там! Сёння гэты раён аброс новабудоўлямі, рознымі аб'ектамі і перастаў быць зялёнай плямай на целе горада. І адбываецца так кругом, з кожным лапікам зямлі ў межах горада. Чалавек наступае на прыроду, не заглядваючы ў будучыню. Таму паветра атручваецца выхлапнымі газамі, выкідамі адходаў прадпрыемстваў, зямля сілкуецца гербіцыдамі. Гэтага нельга зусім пазбегнуць у сучасных умовах, але можна мінімізаваць, хаця б рабіць нейкія крокі на паказаным шляху.

Нядаўна давялося чытаць, што ў свеце атрымлівае распаўсюджанне антынаталізм — сістэма філасофскіх поглядаў, носьбіты якіх негатыўна ставяцца да размнажэння чалавека і лічаць яго неэтычным. Згодна з ідэямі гэтай сістэмы, чалавецтва павінна вымерці, тады Зямлі і жывёлам будзе лепей... Сумная тэорыя, але не скажаш, што поўнасцю пазбаўленая ўсялякага сэнсу.

Дык вось, лепей усё ж заставацца чалавеку ў прыродзе. Таму трэба гаварыць з цяперашнім юным пакаленнем аб адказнасці чалавека за прыроду. Пры любой нагодзе варта спрабаваць дастукацца да іх душы, закласці ў свядомасць хаця б неабходнасць роздуму аб значэнні ўсяго жывога навокал. «Калі бачу спілаванае здаровае дрэва, для мяне гэта як... чалавек забіты», — эмацыянальна даводзіць Наталля Мурыгіна. Яе экскурсію хочацца слухаць.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

Персона

# ЖЫЦЦЁ ЯК ТАНЕЦ

## Народная артыстка аб балеце, выхаванках, сяброўстве з Японіяй і тым, што прымушае хадзіць на работу

**Народная артыстка Беларусі, заслужаная артыстка РСФСР, 83-гадовая Клара МАЛЫШАВА кожную раніцу на рабоце ў 8.30. Роўна ў гэты час яна пачынае заняткі ў балетнай зале харэаграфічнай гімназіі-каледжа. Паблажак ні для сябе, ні для выхаванак ніякіх, бо гэты год для класа Клары Мікалаеўны — выпускны. Апошнія дні, праўда, унеслі шмат мітусні ў жыццё педагога — яна атрымала ордэн Узыходзячага сонца, якім імператар Японіі адзначыў артыстку за асаблівы ўклад у развіццё балета ў гэтай краіне.**



Павага і цеплыня, з якімі ставяцца да выкладчыцы ў сценах роднай гімназіі-каледжа, адчуваюцца літаральна на ўваходзе. Вахцёрка беспамылкова вызначае мэту нашага візіту: «Да Клары Мікалаеўны? Яна ў апошнія дні — нарасхват. Гэта адна з нашых найлепшых педагогаў — яе выхаванкі з міжнародных конкурсаў без узнагарод не вяртаюцца. Хто з ёй можа параўнацца?» І не дзіва, бо 73 гады Клара Малышава прысвяціла мастацтву. Пасля заканчэння харэаграфічнага каледжа 22 гады служыла ў горкаўскім, чэлябінскім і мінскім тэатрах оперы і балета. Яна выканала каля двух дзясяткаў сольных партый, у тым ліку Джульеты, Папялушкі, Эсмеральды, Жызэлі. Завяршыўшы танцавальную кар'еру, на працягу 15 гадоў была мастацкім кіраўніком Мінскага харэаграфічнага вучылішча (цяпер Беларуская дзяржаўная харэаграфічная гімназія-каледж), тут выкладае і сёння. Выхавала не толькі добрую трэць артыстаў Вялікага тэатра оперы і балета Беларусі — яе дзеці, Натэла і Дзяніс Дадышкіліяні, таксама сталі адметнымі танцоўшчыкамі. Натэла мае званне заслужанай артысткі Беларусі.

**«У артыстычным асяроддзі заўсёды няпростыя стасункі, хапае і зайздрасці, а я яшчэ і жонка галоўнага балетмайстра... Хацелася вярнуцца назад у Чэлябінск».**

**— Клара Мікалаеўна, што прымушае вас кожную раніцу ісці на работу?**

— Любоў да прафесіі. А яна ў сваю чаргу патрабуе ад мяне творчасці, падтрымання пэўнага ўзроўню. Дзеці ж павінны ў табе бачыць найперш прафесійнага педагога. Ты іх вучыш прафесіі, і ад таго, як гэта робіш, будзе залежаць якасць іх працы, іх прафесійны лёс.

**— У чым сакрэт вашай выдатнай фізічнай формы?**

— Трымаць сябе ў тонусе вельмі важна. Праўда, чым старэйшай становішся, ты больш намаганняў даводзіцца прыкладаць. Кожную раніцу раблю гімнастыку, каб прывесці мышцы ў парадак. Калі не працаваць над сабой штодзень, гэта вельмі хутка адаб'ецца на самаадчуванні.

**— Калі вы вырашылі стаць балерынай?**

— Я нарадзілася ў 1935 годзе ў Горкаўскай вобласці (цяпер Ніжагародская. — **Аўт.**). Бацька быў капітанам рачнога флоту, усё лета мы праводзілі на Волзе. Перажылі вайну, і ў 1945 годзе, паколькі я была вельмі жвавая і эмацыянальная, мама вырашыла аддаць мяне ў Горкаўскае харэаграфічнае вучылішча. Там я правучылася тры гады. З Пермскага харэаграфічнага вучылішча да нас прыехалі выкладчыкі і са 150 чалавек адабралі 15 — трое хлопцаў і астатнія дзяўчаты, я была ў іх ліку. Так я пераехала на вучобу ў Перм. У 1955 годзе скончыла Пермскае харэаграфічнае вучылішча. Пасля працавала ў Горкаўскім тэатры оперы і балета, потым — у Чэлябінску, а з 1965 года — у Мінску, у тэатры оперы і балета.

**— У Мінск вы прыехалі разам з мужам, знакамітым рэжысёрам-пастаноўшчыкам Атарам Дадышкіліяні. Як вы з ім пазнаёміліся?**

— Калі працавала ў Горкім пасля харэаграфічнага вучылішча, ён прыехаў у наш тэатр у якасці балетмайстра. Пабачыў мяне на сцэне, у рабоце, а потым завязаліся і асабістыя адносіны. У 1956 годзе мы пераехалі ў Чэлябінскі акадэмічны тэатр оперы і балета, ён там працаваў галоўным балетмайстрам. У 1964 годзе яго запрасілі ў Мінск.

**— Вам спадабаўся горад, тэатр?**

— Цяпер Мінск стаў нашмат прыгажэйшы, тады быў больш просты. А тэатр мне адразу спадабаўся. Але спачатку адчувала я сябе не вельмі ўтульна. У артыстычным асяроддзі заўсёды няпростыя стасункі, хапае і зайздрасці, а я яшчэ і жонка галоўнага балетмайстра... Хацелася вярнуцца назад у Чэлябінск, дзе мяне ведалі і любілі, дзе нікому нічога не трэба было даказваць. Я на той час ужо мела званне заслужанай артысткі РСФСР... Але перажыла ўсё, і да 42 гадоў служыла ў тэатры.

**— Вашы дзеці, Натэла і Дзяніс, таксама сталі танцоўшчыкамі. Гэта было іх жаданне ці вы падштурхоўвалі да такога выбару?**

— З Натэлай, а яна была вельмі жвавай, рухавай, я займалася з трох гадоў. Яна была вельмі здольнай дзяўчынкай. Але калі яна пайшла ў вучылішча, я над ёй не трэслася — аддала педагогу і не ўмешвалася. А вось сына, здаецца, больш кантралявала: я сама на той час ужо працавала ў вучылішчы, і яго сюды прывяла. Ён быў добрым танцоўшчыкам, такіх называюць характарнымі акцёрамі, выканаў шмат партый і ў оперным тэатры, і ў музычным. Цяпер ён педагог, з Ірынай Пушкаровай працуе ў інклюзіў-тэатры, ставяць спектаклі з удзелам дзяцей, у тым ліку і з асаблівасцямі. Натэла ўжо некалькі гадоў працуе ў Амане. З мужам мы рассталіся, ён вярнуўся ў Ніжні Ноўгарад, амаль тры дзесяцігоддзі працаваў там галоўным рэжысёрам тэатра, і цяпер без яго жыць не можа, два гады таму паставіў балет «Спартак». Але яму ўжо 95, апошнім часам з'явіліся праблемы са зрокам.

**— Вашы ўнукі працягнуць балетную дынастыю?**

— У мяне іх двое. Унук вучыцца ў каледжы мастацтваў, выдатна малюе, заканчвае музычную школу, ён барабаншчык. Ва ўнучкі, а ёй зараз восем, ёсць усе даныя для балета, але яна не захацела займацца. Таксама пайшла ў мастацкі каледж, і малюе добра, і лепіць. Магчыма, калі ёй споўніцца дзесяць, паспрабую прывесці ў наш каледж — шкада губляць такія даныя і перапыняць дынастыю *(усміхаецца)*.

**— Нядаўна ваш уклад у развіццё балета Японіі адзначыў імператар Краіны ўзыходзячага сонца. А ваш вопыт работы з японскімі дзецьмі пачаўся ў далёкім 1983 годзе...**

— Спачатку японцы прыязджалі па лініі «Інтурыста». Пасля заключылі дагавор з нашым харэаграфічным вучылішчам, як тады называўся каледж, і па сёння мы з імі кантактуем, у нас цяпер вучыцца дзевяць будучых артыстаў балета з гэтай краіны. Я, напрыклад, сёлета выпускаю дзяўчынку — вельмі здольная, тэхнічная. Яна ў нас ужо танцуе ў балеце «Шчаўкунок» партыю Машы.

З 1988 года мяне запрашалі ў Японію даваць майстар-класы, і кожнае лета месяц-два я ездзіла па ўсёй краіне. Мне там падабалася — японцы надзвычай спакойныя, усмешлівыя. Я быццам бы на адпачынку была, хоць працаваць даводзілася шмат. Вярталася напоўненая энергіяй, зусім у іншым стане. Мы адбіралі ў каледж шмат дзяцей з Японіі. Яны ў нас вучыліся 2-3 гады, атрымлівалі дыпломы.



Клара МАЛЫШАВА са сваёй выхаванкай Багданай АЛЯКСЕЕВАЙ.

**— З чым звязана такая іх цікавасць да нашага балета?**

— З 1981 года японцы пачалі звяртацца да класічнага танца. Сталі запрашаць на гастролі замежныя балетныя трупы. Потым самі адкрылі класічны балетны тэатр. Зразумелі і палюбілі класіку. І я ва ўсіх гарадах выкладала менавіта класічны танец.

**— Японцы адрозніваюцца па сваіх даных для балета?**

— Яны і знешне, і ўнутрана адрозніваюцца. Калі шчыра, у Японіі складана з фізічнымі данымі для балета — тымі, якія мы патрабуем. У іх іншыя і прапорцыі, і фізічныя магчымасці. Але ўсё роўна яны стараюцца навучыцца танцаваць. Гэта вельмі працаздольная нацыя, калі за нешта бяруцца, то абавязкова свайго даб'юцца.

**— Хто, на ваш погляд, сёння яркія асобы ў балеце?**

— Ад вучаніц ведаю, што яны арыентуюцца на Ульяну Лапаткіну, Вольгу Смірнову, Святлану Захараву. Сёння дастаткова таленавітых балерын.

**— Клара Мікалаеўна, вашы навучэнцы жывуць і працуюць па ўсім свеце. Кім з іх ганарыцеся?**

— Так, за мяжой працуюць мае выпускнікі, у нашым оперным тэатры вялікая колькасць нашых выхаванцаў. Мая выхаванка, напрыклад, народная артыстка Людміла Кудраўцава, выконвала партыі Эсмеральды, Ізольды, Джульеты, Жызэль, Кармэн. Мае вучаніцы выкладаюць і ў нашым каледжы — Наталля Кузьменка, Жанна Лебедзева.

**— Як вашы выхаванкі ставяцца да вас?**

— Здаецца, добра! Вы лепш у іх спытайце.

— Клара Мікалаеўна — выдатны педагог, навучыла мяне ўсяму з нуля. Калі б не яе патрабавальнасць і цярплівасць, з мяне, магчыма, нічога б не атрымалася, — дадае Багдана Аляксеева, навучэнка класа Клары Малышавай.

**Алена КРАВЕЦ.**
**Фота Таццяны ТКАЧОВАЙ.**

# Маладосць. Праца. Рамантыка

## На Усебеларускім злёце студатрадаў падвялі вынікі за мінулы год



Фота БелТА.

**Пачуць душэўныя песні пад гітару і пранікнуцца працоўным духам маглі ўсе прысутныя на адкрыцці Усебеларускага злёту студэнцкіх атрадаў «Маладосць. Праца. Рамантыка». У ім прынялі ўдзел больш за 400 байцоў, камандзіраў, камісараў і ветэранаў студатрадаўскага руху з усіх рэгіёнаў краіны.**

Перад урачыстым адкрыццём у Нацыянальнай бібліятэцы госці пазнаёміліся з інтэрактыўнымі пляцоўкамі гісторыі руху студэнцкіх атрадаў Беларусі. На цырымоніі падвядзення вынікаў рэспубліканскага конкурсу «Працоўны семестр — 2018» вызначылі найлепшыя студэнцкія атрады. Напрыклад, найлепшым будаўнічым стаў атрад «Дойліды» Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта, медыцынскім — «Медык» Полацкай раённай арганізацыі БРСМ, а педагагічным — «Палаючыя сэрцы» Бярозаўскай раённай арганізацыі БРСМ. Пераходзячы сцяг атрымаў студэнцкі будаўнічы атрад «Эўрыка» Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта. Яго ўдзельнікі працавалі на будаўніцтве Беларускай АЭС некалькі гадоў.

**Дзмітрый ВАРАНЮК, першы сакратар ЦК БРСМ**, павіншаваў усіх прысутных з выдатным заканчэннем працоўнага семестра і вызначыў новыя задачы на наступны:

— У 2018 годзе было сфарміравана больш за дзве тысячы студатрадаў па розных профілях, у якіх удзельнічала 26 тысяч чалавек. Праца — гэта тое, што ляжыць у аснове беларускай дзяржаўнасці, у выхаванні патрыётаў краіны. Радуе, што ў нашых шэрагах шчыруюць тыя, хто даказвае справай, што такое студатрад. Вядома, без ветэранаў гэты рух не існаваў бы, таму вялікі дзякуй ім за тое, што яны рабілі і працягваюць рабіць. Мы будзем і надалей у іх вучыцца. Наперадзе для студатрадаў стаіць шмат задач: будоўля паліклінікі ў Астраўцы, праца на Еўрапейскіх гульнях і іншых аб'ектах. Таму важна не спыняцца, а памнажаць свае дасягненні.

**Дар'я ШЛАПАКОВА.**

БЕЛАРУСКІ НАРОДНЫ БАНК
BELARUSKY NARODNY BANK

## Уважаемые акционеры Открытого акционерного общества «Белорусский народный банк»

29 марта 2019 года в 10.00 состоится очередное Общее собрание акционеров ОАО «БНБ-Банк»

Повестка дня собрания:

1. Об отчете руководителя об итогах деятельности Банка в 2018 году.
2. О рассмотрении заключения Ревизионной комиссии по результатам проверки деятельности Банка за 2018 год.
3. О рассмотрении аудиторского заключения подготовленного по результатам ежегодного аудита Банка, в том числе результатов внешней независимой оценки эффективности корпоративного управления.
4. Об утверждении годового отчета, бухгалтерского баланса, отчета о прибылях и убытках Банка за 2018 год.
5. О распределении прибыли Банка за 2018 год.
6. Об объявлении (выплате) дивидендов в ОАО «БНБ-Банк» за 2018 год.
7. О порядке выплаты дивидендов ОАО «БНБ-Банк» за 2018 год.
8. Об избрании членов Совета директоров Банка.
9. Об избрании членов Ревизионной комиссии Банка.
10. Об определении размера вознаграждения членам Совета директоров и ревизионной комиссии за исполнение ими своих обязанностей.
11. О внесении изменений и дополнений в Устав Банка.

Очередное Общее собрание акционеров ОАО «БНБ-Банк» состоится в конференц-зале гостиницы Renaissance Minsk Hotel по адресу: г. Минск, пр-т Дзержинского, 1е.

Дата формирования реестра владельцев акций ОАО «БНБ-Банк» для составления списка лиц, имеющих право на участие в Собрании, – 18 марта 2019 года.

С информацией, относящейся к вопросам, включенным в повестку дня, можно ознакомиться по адресу: г. Минск, пр-т Независимости, 87а, с 7 марта 2019 года в рабочие дни с 09.00 до 17.00 (перерыв с 12.30 до 13.15).

Время начала регистрации – 09.00, окончания регистрации – 10.00.

Телефон для справок **+375 (17/29/33) 309 7 309** или короткий номер **7 309** для всех мобильных операторов. www.bnb.by

Лицензия на осуществление банковской деятельности,
выданная Национальным банком Республики Беларусь, № 10 от 7 июня 2013 г.
УНП 100513485



Центр Промышленной Оценки

- **Организация аукционов**
- **Оценка всех видов имущества**

**Извещение о проведении повторного аукциона**

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | ОАО «Оршаагропроммаш», Витебская обл., г. Орша, ул. Ленина, 215 |

**Предмет аукциона**

**Лот № 1 –** объекты недвижимого имущества, реализуемые одним лотом

| Наименование (назначение) | Общ. пл. | Инв. номер |
|---|---|---|
| **Производственный корпус цеха** | 16 006,4 кв. м | 110/С-110941 |
| Адрес: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Кирова, д. 79/13 | | |
| **Площадка завода металлоконструкций** | 3 014,0 кв. м | 110/С-113604 |
| Адрес: г. Барановичи, ул. Кирова, д. 79, площадка завода металлоконструкций | | |
| **Открытый склад металла** | 1 723,0 кв. м | 110/С-112475 |
| Адрес: г. Барановичи, ул. Кирова, д. 79, открытый склад металла | | |
| **Ливневая канализация 1** | 879,5 м | 110/С-114664 |
| Адрес: г. Барановичи, ул. Кирова, 79, ливневая канализация 1 | | |
| **Ливневая канализация 2** | 281,3 м | 110/С-114665 |
| Адрес: г. Барановичи, ул. Кирова, 79, ливневая канализация 2 | | |
| Водопровод | 618,7 м | 110/С-114547 |
| Адрес: г. Барановичи, ул. Кирова, 79, водопровод | | |
| **Производственный водопровод** | 1 160,5 м | 110/С-114545 |
| Адрес: г. Барановичи, ул. Кирова, 79, производственный водопровод | | |
| **Хозяйственная фекальная канализация** | 1 053,8 м | 110/С-114546 |
| Адрес: г. Барановичи, ул. Кирова, 79, хозяйственная фекальная канализация | | |
| **Телефонизация (слаботочные сети)** | 514,5 м | 110/С-115057 |
| Адрес: г. Барановичи, ул. Кирова, 79, телефонизация (слаботочные сети) | | |
| **Кабельные линии электропередач 10 кВ** | 862 м | 110/С-115059 |
| Адрес: г. Барановичи, ул. Кирова, 79, кабельные линии электропередач 10 кВ | | |
| Трансформатор 630 Квт | – | – |
| Трансформатор 630 Квт | – | – |

***Сведения о земельном участке***: пл. **2,4736** га, предоставлен продавцу для обслуживания производственного корпуса цеха, открытого склада металла, площадки завода металлоконструкций на праве постоянного пользования

**Начальная цена с НДС 20 % – 961 021,84 бел. руб. (снижена на 80 %)**

**Лот № 2 –** объекты недвижимого имущества, реализуемые одним лотом

| Наименование (назначение) | Общ. пл. | Инв. номер |
|---|---|---|
| **Цех блоков** | 3 748 кв. м | 110/С-85251 |
| Адрес: г. Барановичи, ул. Кирова, д. 79 | | |
| **Автодорога бетонных блоков** | 9 048 кв. м | 110/С-112843 |
| Адрес: г. Барановичи, ул. Кирова, д. 79, автодорога бетонных блоков | | |
| **Здание гаража** | 30,5 кв. м | 110/С-111500 |
| Адрес: г. Барановичи, ул. Кирова, д. 79/ 16 | | |
| **Здание гаражей** | 459,7 кв. м | 110/С-111499 |
| Адрес: г. Барановичи, ул. Кирова, д. 79/ 17 | | |
| **Открытый склад готовой продукции** | 4 226 кв. м | 110/С-112473 |
| Адрес: г. Барановичи, ул. Кирова, д. 79, открытый склад готовой продукции | | |
| **Склад извести** | 119,6 кв. м | 110/С-111540 |
| Адрес: г. Барановичи, ул. Кирова, д. 79/ 26 | | |
| **Склад цемента** (составные части: подвал, навес) | 63,0 кв. м | 110/С-85258 |
| Адрес: г. Барановичи, ул. Кирова, д. 79 | | |
| **Склад сыпучих материалов** | 1885,3 кв. м | 110/С-85261 |
| Адрес: г. Барановичи, ул. Кирова, д. 79/ 24 | | |

| | |
|---|---|
| **Сведения о земельных участках** | пл. **2,2139** га, предоставлен продавцу для обслуживания цеха блоков, автодороги бетонных блоков, здания гаража, здания гаражей, открытого склада готовой продукции, склада извести, склада цемента, склада сыпучих материалов на праве постоянного пользования |
| | пл. **0,4901** га, предоставлен продавцу для обслуживания склада сыпучих материалов на праве постоянного пользования |

**Начальная цена с НДС 20 % – 313 134,09 бел. руб. (снижена на 80 %)**

С подробной информацией по предмету аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона WWW.CPO.BY

**Задаток 1 % от начальной цены лота** в белорусских рублях перечисляется на р/с № BY60BLBB30120191021390001001; в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи:** 10 рабочих дней после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» 07.02.2019 г.

**Аукцион состоится 13.03.2019 в 12.00** по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 11.03.2019 до 17.00 по** указанному адресу

**Тел.: +375 17 280-36-37; 8 029 317-95-42. E-mail: auction@cpo.by**


# ПРАВИЛА ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ «АВТО ОТ МАСТЕРКАРД. МАРТ»

**1. Организатор Рекламной игры**

Закрытое акционерное общество «Сэлмон-Графикс» (далее – Организатор), УНП 100843219, адрес: 220073, г. Минск, ул. Ольшевского, д. 22, пом. 11, комн. 43.

Заинтересованным лицом Рекламной игры является: общество с ограниченной ответственностью «Рефорте», УНП 100422707 (далее – Заинтересованное лицо).

**2. Наименование и территория проведения Рекламной игры**

Рекламная игра носит название «Авто от Мастеркард. Март» (далее – Игра) и проводится на территории автозаправочных станций предприятий по нефтепродуктообеспечению, входящих в Государственное производственное объединение «Белоруснефть» (далее – ПО «Белоруснефть»), находящихся в Республике Беларусь.

**3. Срок начала и окончания Игры**

Игра проводится с 1 марта 2019 г. по 28 апреля 2019 г. (включая периоды розыгрышей и вручения призов).

**4. Комиссия по проведению Игры**

Для проведения Игры Организатор утверждает комиссию по проведению Игры (далее – Комиссия) в составе 5 человек, в том числе председателя Комиссии.

Состав Комиссии:

Черненков Павел Леонидович – индивидуальный предприниматель, управляющий ЗАО «Сэлмон-Графикс» – председатель Комиссии;

Стельмах Александр Петрович – заместитель директора по правовым вопросам ООО «Медиа Крама»;

Жуковец Василина Сергеевна – ведущий специалист отдела рекламных проектов ЗАО «Сэлмон-Графикс»;

Бычик Юлия Владимировна – специалист по кадрам ЗАО «Сэлмон-Графикс»;

Глыздова Диана Дмитриевна – специалист по работе с клиентами отдела по работе с клиентами № 2 ООО « Сэлмон Медиа».

**5. Наименование товаров/услуг, в целях стимулирования реализации которых проводится Игра**

Игра проводится в целях стимулирования использования банковских платежных карточек международной платежной системы Mastercard (далее Карта Mastercard), за исключением карт Maestro и Белкарт/Maestro, для оплаты топлива на автозаправочных станциях предприятий по нефтепродуктообеспечению, входящих в ПО «Белоруснефть».

**6. Условия, при соблюдении которых физическое лицо становится участником Игры**

6.1. К участию в Игре допускаются совершеннолетние (достигшие 18 лет) граждане Республики Беларусь, постоянно проживающие в Республике Беларусь, а также иностранные граждане и лица без гражданства, имеющие вид на жительство на территории Республики Беларусь, являющиеся держателями действующей банковской карты Mastercard, за исключением карт Maestro и Белкарт\Maestro с учетом ограничений, указанных в данных правилах (далее – Участник Игры).

6.2. Участником Игры не может быть лицо, состоящее в трудовых отношениях с Организатором, супруг (супруга) такого лица, его близкие родственники, а также лица, находящиеся с таким лицом в отношениях свойства, члены Комиссии.

6.3. Для участия в Игре необходимо выполнить следующие условия: в период с 1 марта 2019 г. по 31 марта 2019 г. включительно совершить покупку топлива по Карте Mastercard, за исключением карт Maestro и Белкарт/ Maestro, на АЗС сети ПО «Белоруснефть» на сумму не менее 0,60 бел. руб. **(шестьдесят копеек)** одним чеком с использованием зарегистрированной накопительной информационно-учетной карты (в дальнейшем – Карта Белоруснефть), которая определяет физическое лицо как участника программы лояльности клиентов (физических лиц) ПО «Белоруснефть» (далее – Программа), проводимой на АЗС сети «Белоруснефть».

Зарегистрированной считается Карта «Белоруснефть» при указании ее владельцем в анкете регистрации следующих данных: фамилии, имени, отчества, даты рождения, номера мобильного телефона операторов сотовой связи в международном формате, а также адреса электронной почты.

В Игре не принимают участие покупки, оплаченные частично или полностью, бонусными баллами по банковской платежной карте «Халва Плюс» (в том числе и через карту «ИКС-карта» от ЗАО «МТБанк»).

6.4. Участник Игры может участвовать в Игре только один раз независимо от количества и сумм совершенных покупок.

**7. Состав и размер призового фонда и источники его формирования**

Размер призового фонда игры составляет **35 612,61 (тридцать пять тысяч шестьсот двенадцать) белорусских рублей 61 копейка**. Состав призового фонда:

| Наименование | Количество, шт. | Стоимость за единицу, бел. руб. | Общая стоимость, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| Автомобиль Ford Focus Trend<br>Год выпуска: 2018<br>Цвет кузова: синий металлик<br>Номер кузова: Z6F5XXEEC5JA60545 | 1<br><br><br>1 | 31 000,00 | 35 612,61 |
| И денежные средства для уплаты налога в размере **4 612,61** белорусского рубля | | 4 612,61 | |

Источником формирования призового фонда Игры являются денежные средства Заинтересованного лица – ООО «Рефорте».

**8. Проведение розыгрыша призового фонда**

**8.1. Место, дата и время проведения розыгрыша**

Розыгрыш призового фонда проводится открыто в присутствии Комиссии по адресу: г. Минск, ул. Лещинского, 4а (офис Республиканского дочернего унитарного предприятия «Белоруснефть – Нефтехимпроект»).

Дата и время проведения розыгрыша: 11 апреля 2019 г. в 16.00.

8.2. Порядок проведения розыгрыша призового фонда, в том числе порядок определения победителей.

8.2.1. Для розыгрыша в установленном порядке формируется список участников (далее – Список), с указанием даты первой транзакции, соответствующей условиям Рекламной игры, присвоенного номера шанса, номера карты, фамилии, имени, отчества участника, даты рождения, электронного адреса, телефона, населенного пункта и области.

Каждому Участнику Игры, выполнившему условия, указанные в подпункте 6.3 данных правил, присваивается порядковый номер (далее – номер Участника) по номеру Карты Белоруснефть в порядке возрастания. Все номера Участников имеют одинаковую разрядность.

8.2.2. Для проведения розыгрыша используется специальный вращающийся непрозрачный барабан и набор шаров в количестве 10 штук с номерами от 0 по 9.

Определение выигрышного номера Участника происходит путем его формирования поразрядно слева направо из номеров шаров, последовательно извлекаемых из лототрона.

Для определения цифры первого слева разряда выигрышного порядкового номера в барабан помещаются шары с номерами от «0» до цифры, соответствующей первой слева цифре последнего порядкового номера Участника из Списка. Из барабана извлекается один шар. Номер извлеченного шара вносится в протокол и записывается в первый слева разряд формируемого выигрышного номера Участника.

Далее, для определения цифры в следующем разряде формируемого выигрышного номера Участника, в барабан загружаются шары с номерами, которые существуют в соответствующем разряде номеров Участников в Списке. Шары перемешиваются, и из барабана извлекается один шар. Номер шара вносится в протокол и записывается в соответствующий разряд формируемого выигрышного номера Участника.

Определение 1 (одного) альтернативного выигрышного номера Участника (альтернативного победителя) происходит следующим образом: альтернативным победителем становится Участник Игры с номером Участника через 6000 номеров от победившего номера Участника.

В случае если выпавший номер Участника находится в конце Списка, то исчисление для определения альтернативного победителя продолжается с начала Списка.

8.2.3. При проведении розыгрыша Комиссией оформляется протокол розыгрыша.

8.2.4. Участники Игры вправе присутствовать при проведении розыгрыша.

**9. Срок и способ информирования победителя, место, порядок и срок выдачи выигрыша**

9.1. После проведения розыгрыша Организатор уведомляет победителя о выигрыше по почте, телефону, электронной почте и SMS не позднее 15 апреля 2019 г. включительно.

9.2. Для получения приза победителю необходимо в срок до 18 апреля 2019 г. включительно представить Организатору по электронной почте: igra@salmongraphics.by следующие данные:

9.2.1. для граждан Республики Беларусь, а также иностранных граждан и лиц без гражданства, имеющих вид на жительство на территории Республики Беларусь:

– копию страницы 25, страниц 31–33 паспорта – для граждан Республики Беларусь;

– копию страницы 3, страниц 15–17 вида на жительство – для лиц, имеющих вид на жительство на территории Республики Беларусь;

9.2.2. для иностранных граждан и лиц без гражданства, не имеющих вида на жительство:

– копию паспорта страны, гражданином которой он является (для лиц без гражданства – документ, подтверждающий их личность, выданный в порядке законодательства страны фактического проживания). В случае если данный документ выдан не на государственном языке Республики Беларусь, также заверенный нотариально перевод такого документа на государственный язык Республики Беларусь.

9.3. Вручение приза производится по адресу: Республика Беларусь, Минский р-н, ул. Боровая, д. 2 в срок до 22 апреля 2019 г. включительно. Победитель предварительно согласовывает дату и время прибытия за получением приза с Организатором по телефону +375 17 216-80-77.

9.4. В случае если в установленные данными правилами сроки не удается связаться с победителем любым из указанных выше способов, либо победитель не представит данные, необходимые для получения приза, либо представленные данные не соответствуют данным, указанным в анкете участника программы лояльности клиентов – физических лиц ПО «Белоруснефть», заполняемой при регистрации Карты «Белоруснефть», либо победитель отказывается от приза, либо победитель не явился за получением приза, право на приз переходит альтернативному победителю.

9.5. Альтернативный победитель уведомляется о выигрыше по электронной почте, телефону, почте и SMS до 23 апреля 2019 г. включительно. Для получения приза альтернативный победитель, которому перешло право на получение приза, должен до 25 апреля 2019 г. включительно предоставить Организатору по электронной почте: igra@salmongraphics.by данные, указанные в п. 9.2. правил, а также согласовать дату и время получения приза. Вручение приза производится по адресу: Республика Беларусь, Минский р-н, ул. Боровая, д. 2 в срок до 28 апреля 2019 г. включительно.

9.6. Альтернативный победитель утрачивает право на получение приза если с ним не удается связаться любым из указанных выше способов, либо альтернативный победитель не предоставит данные, необходимые для получения приза, либо предоставленные данные не соответствуют данным, указанным в анкете участника программы лояльности клиентов – физических лиц ПО «Белоруснефть», заполняемой при регистрации Карты «Белоруснефть», либо альтернативный победитель отказывается от приза, либо альтернативный победитель не явился за получением приза.

9.7. В случае если победитель (альтернативный победитель) не может приехать за получением приза лично, приз может получить его доверенное лицо по предъявлении копии паспорта либо вида на жительство победителя (альтернативного победителя), своего паспорта либо вида на жительство и нотариально заверенной либо приравненной к таковой доверенности от победителя (альтернативного победителя).

9.8. С момента передачи приза к победителю (альтернативному победителю) переходят все риски и обязательства, связанные с владением, пользованием и распоряжением призом. Денежная компенсация стоимости призов не производится. Победитель либо альтернативный победитель (в случае его нежелания получить приз) не вправе передать право на получение приза другому лицу. Приз не подлежит замене.

9.9. В соответствии с законодательством Республики Беларусь при выдаче призов Организатор удерживает и перечисляет в бюджет подоходный налог в порядке, установленном законодательством Республики Беларусь, из суммы денежных средств соответствующего приза. Вручение призов осуществляется за минусом удержанной суммы подоходного налога из денежной части приза.

9.10. Организатор не оплачивает победителю (альтернативному победителю) расходы, связанные с проездом к месту получения приза.

**10. Порядок информирования об условиях и результатах Игры**

10.1. Факт участия в Игре означает, что Участники Игры соглашаются с тем, что их имена, отчества, фамилии, фото-, аудио-, видео- и иные материалы о них могут быть использованы Организатором и Заинтересованным лицом в любых рекламных и (или) информационных материалах, связанных с проведением Игры, без уплаты какого-либо вознаграждения Участникам. Победитель Игры дает свое согласие на интервью в средствах массовой информации и съемку для рекламных материалов, подготовленных в связи с проведением данной Игры, без выплаты ему какого-либо вознаграждения. Все права на такие рекламные материалы принадлежат Организатору, заинтересованному лицу.

10.2. Участник Игры, претендующий на получение приза, обязуется заполнить и подписать все необходимые документы, предоставляемые Организатором Игры для получения приза.

10.3. Участие в Игре предполагает ознакомление и полное согласие Участников Игры с настоящими Правилами.

10.4. Правила проведения Игры вместе с реквизитами государственной регистрации публикуются до начала Игры в газете «Звязда». Информация о результатах розыгрыша публикуется до 27 апреля 2019 г. включительно в газете «Звязда».

10.5. Телефон для справок по вопросам проведения Игры: (МТС – 033, Velcom – 029, Life – 025) 6 431 431 круглосуточно без выходных.

Свидетельство № 3485 о государственной регистрации Рекламной игры, зарегистрированной 15 февраля 2019 г., выдано Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь.

# Гігі, заглядуха, бачэлкі

## Паэтычная энцыклапедыя Уладзіміра Ліпскага

**Заўсёды для сябе падзяляю кнігі на некалькі катэгорый — кнігу-альбом, кнігу-паўзу і кнігу-шлях. Кніга-альбом — гэта тая, праходзячы па старонках якой, ты нібы гартаеш фотаздымкі, выразнымі вобразамі паўстаюць перад табой падзеі, яскравыя і цікавыя, якія потым будзеш не раз прыгадваць, цешыцца і перачытваць. Кніга-паўза — гэта тая, якая паглынула цябе, і ты нібыта перастаў дыхаць на той час, пакуль чытаў яе, але ж, вярнуўшыся ў свой свет, заўважаеш, што нічога не змяняецца, ты быццам спаў. Іншая ж справа кніга-шлях — з першай яе старонкі ты ідзеш незнаёмай дарогаю, каб потым, дайшоўшы да канца, зразумець — твой навакольны свет не змяніўся, але нешта адбылося з табой самім...**

Калі я першы раз узяла ў рукі кнігу Уладзіміра Ліпскага «Мая Беларусь», то адразу зразумела, што яна будзе для мяне кнігай-альбомам. Мілагучная мова, прыгожыя ілюстрацыі (цудоўная работа мастака-графіка Віталя Дударэнкі), блізкія сэрцу тэмы. Да таго да шчымлівасці знаёмы стыль, на якім вырасла не толькі я, але і некалькі пакаленняў беларусаў, бо вядома, што Уладзімір Сцяпанавіч — нязменны рэдактар часопісаў «Вясёлка» і «Буся». Але пачынаючы з жанру твора, а аўтар акрэсліў яго як аповесць-споведзь, я пакрысе разумела, што нашае знаёмства з гэтай кнігай не будзе звычайным.

У «Маёй Беларусі» няма дакладнай структуры і кампазіцыі — па яе старонках вольным патокам ліецца аўтарскі спеў роднаму краю, у якім, нібыта ў народнай песні, усімі фарбамі пераліваецца беларуская мова. То літаратурная, чыстая ў сваёй крыштальнай дакладнасці, то народная, жывая і гаманкая. Так, напрыклад, мы даведваемся, што ў блізкіх для аўтара Аўцюках сяброўку клічуць «тэйкай», а на адной са старонак сустракаемся са спадчынай Івана Насовіча — даследчыка-мовазнаўца, які ўвекавечыў сваё імя ў «Слоўніку беларускай мовы». Праз пасрэдніцтва Уладзіміра Сцяпанавіча далятаюць да нас такія цікавыя словы, як выляжанка (гультайка), гігі (смех), заглядуха (прыгажуня), бачэлкі (вочы). Увогуле, шмат аўтар звяртаецца да твораў, даследаванняў і дасягненняў славутых беларусаў, шмат каго згадвае ў сваім аповедзе, такім чынам нібы збіраючы разам з імі нашу Беларусь па кавалках.




Асаблівая ўвага на старонках кнігі — вёскам, гарадам, рэкам і азёрам. Ліпскі ўмела і з вялікай руплівасцю ўпісвае іх назвы і гісторыі ў агульны кантэкст, тым самым ператвараючы літаратурны твор у свайго роду шляхавод па краіне, кнігу-знаёмства для замежніка, карту Радзімы для беларуса. Ёсць на ёй саборы і палацы, ёсць пушчы і бары, БелАЗ і «Мінск-Арэна». Сустрэўшыся з імі на старонках кнігі, чамусьці наноў пераасэнсоўваеш іх значэнне, пачынаеш адчуваць іх нейкую асаблівую блізкасць.

Гісторыя, да якой аўтар падыходзіць з пяшчотнай павагай, на старонках «Маёй Беларусі» жывая і блізкая, зразумелая кожнаму, ад маленькага да вялікага. Са старонак глядзяць на нас сапраўдныя мысляры і паэты. Прытуляе да сябе свой знакаміты крыж мужная Ефрасіння Полацкая, задуменна глядзіць на лістоўку «Мужыцкай праўды» Кастусь Каліноўскі, узнімаецца над роднай зямлёй вобраз славутага Ігната Дамейкі. У некаторы момант я нават лаўлю сябе на думцы, што хацела б назваць «Маю Беларусь» паэтычнай энцыклапедыяй, настолькі шмат у ёй Беларусі, настолькі дакладна аўтар перадае яе прыгажосць.

Якімі б звыклымі ні здаваліся нам словы пра любоў да Радзімы, кожны ўсё ж адчувае, наколькі важнай часткай нашага жыццёвага падмурку яна з'яўляецца, як менавіта яна можа падтрымаць чалавека ў складаныя хвіліны, калі здаецца, што ўсё абрушваецца, як картачны домік. Заўсёды домам застануцца мясціны, дзе ты ўпершыню мачыў ножкі ў цёплай лужыне, назіраў за вясёлкай пасля дажджу, хаваўся ад навальніцы. Струхнеюць сцены, абваляцца дахі, а зямля, лес, поле, той кавалачак, ад якога цягнецца чалавечае карэнне, назаўсёды застанецца для яго домам. Кніга «Мая Беларусь» сталася для мяне і кнігай-шляхам, які я распачынала з планаў чытаць пра Беларусь Уладзіміра Ліпскага, а скончыла паглыбленнем у сваю.

**Паліна ГРЫБ.**

Пантэон Айчыны

# Жыгімонт Аўгуст

*(1520—1572)*

**Жыгімонт Аўгуст быў апошні гаспадар незалежнага Вялікага Княства Літоўскага, і ён стаў першым правіцелем Рэчы Паспалітай — федэратыўнай дзяржавы Каралеўства Польскага і Вялікага Княства Літоўскага. Ён быў апошні з каралеўскай дынастыі Ягайлавічаў.**

Сучаснікі аднагалосна характарызуюць Жыгімонта Аўгуста, як бязвольнага і кволага чалавека, няздатнага правіць дзяржавай. Востры на язык беларускі шляхціц Іван Мялешка ўвогуле з пагардай адазваўся аб Жыгімонце Аўгусце: «Того нечего и в люди личити, бо Подляше и Волынь наш вытратив, ляхом менечися». Добрых слоў не заслужыў ад літвінаў. Хоць яны звязвалі з Жыгімотам Аўгустам шмат спадзяванняў і 4 снежня 1522 года «Сгодными голосы и добровольным позволением» выбралі яго вялікім князем літоўскім.

На характар Жыгімонта Аўгуста паўплывала ягоная маці — каралева Бона Сфорца. Хітрая і ўладная каралева хацела выхаваць сына паслухмяным сабе і праз яго самой правіць Польшчай і Літвой пасля смерці састарэлага мужа Жыгімонта. Хлопчык рос распешчаным і капрызным, да вучобы не ляжала сэрца, затое любіў забавы і гульні ў атачэнні дзяўчат. Бацька-кароль сумна глядзеў, як сын «дарэмна губляе час сярод зграі дзяўчат і нявестаў». Відаць, каб прыцягнуць каралевіча да дзяржаўных спраў і выхаваць самастойнасць і адказнасць, Жыгімонт у 1529 годзе згадзіўся з просьбай літвінаў перадаць сыну ў кіраванне Вялікае Княства Літоўскае. Але рэальную ўладу ў княстве захаваў у сваіх руках.

Пакуль Жыгімонт Аўгуст весяліўся з дзеўкамі на каралеўскім двары і не нёс цяжару дзяржаўнага клопату, яго задавальняла такое становішча — уладара без улады і адказнасці. Але, калі ён пасталеў і ў 1543 годзе ажаніўся з дачкой аўстрыйскага эрцгерцага Фердынанда Габсбурга, Альжбетай, роля ўладара без гаспадарства стала яму не па душы. «Сорамна мне, — казаў ён, — перад самім сабой і людзьмі. Я кароль і князь, але без каралеўства і ўлады княскай і не маю месца, дзе мог бы жыць з каралевай-жонкай». Але больш за ўсё ён хацеў вырвацца з-пад гнятлівай апекі маці. Упершыню Жыгімонт Аўгуст праявіў настойлівасць і актыўнасць. Па яго просьбе літвінская шляхта на Берасцейскім сойме ў 1544 годзе прасіла Жыгімонта перадаць уладу ў Вялікім Княстве сыну, што ён і зрабіў. Непрызвычаены да цяжкой і сістэматычнай працы Жыгімонт Аўгуст не абцяжарваў сябе дзяржаўнымі справамі, пераклаўшы іх на вяльмож і найбліжэйшага дарадчыка Мікалая Радзівіла Чорнага. Куды больш увагі аддаваў вялікі князь уладкаванню свайго палаца ў Вільні, упрыгожваў яго карцінамі і габеленамі, збіраў багатую бібліятэку і ювелірныя вырабы. Дарагія і вытанчаныя рэчы зрабіліся для Жыгімонта Аўгуста атрыбутам ягонай велічы. У шыкоўным рэнесансным палацы ладзіліся вясёлыя балі і маскарады, што са здзіўленнем адзначыў замежны сведка: «Акружыла яго цэлая зграя нежанатых аднагодкаў: смех і размовы толькі аб дзяўчатах, а пасля танцы, гутаркі, музыка, флірты, паляванне і на тым сыходзілі дарэмна ягоныя найлепшыя гады». Мірная перадышка і ўнутраны спакой, якія выпалі Вялікаму Княству падманвалі бясхмарным становішчам. І як бачым, Жыгімонт Аўгуст не выкарыстаў спрыяльны час для ўмацавання дзяржавы і траціў сябе на балях і паляваннях. Калі ён і паказаў сябе, як гаспадар, дык і тое ў абароне асабістых інтарэсаў — праз «няслушны шлюб» з Барбарай Радзівіл. Стаўшы ў 1548 годзе пасля смерці бацькі польскім каралём, Жыгімонт Аўгуст накіраваў свае намаганні на адстойванне шлюбу з каханай Басяй, якую польская шляхта не хацела бачыць сваёй каралевай. На сойме кароль рэзка заявіў, што гатовы адмовіцца ад каралеўства і хай у «апошняй кашулі» застацца разам са сваёй жонкай. Калі нарэшце сціхлі страсці, ён усе ж каранаваў Барбару. Але яна нядоўга пражыла і неўзабаве пасля цяжкой хваробы памерла. Усе дні хваробы кароль не адыходзіў ад ложка каханай, асабіста даглядаў яе. Драматычнае каханне Жыгімонта Аўгуста да сваёй падданай, якую зрабіў каралевай, стала прыцягальным сюжэтам для мастацкіх твораў, і такім чынам у гісторыю ён увайшоў гэтымі неардынарнымі ўчынкамі.

Прыгнечаны стратай каханай Басенькі, Жыгімонт Аўгуст надоўга адышоў ад дзяржаўных спраў, якія ён пусціў на самацёк, адкладваючы іх вырашэнне «на заўтра», а то і «на іншы час», спадзеючыся на іх самаўладкаванне. Яго так і празвалі «кароль Заўтра». Адносна спакойнае праўленне Жыгімонта Аўгуста было часам згубленых магчымасцяў для пераўтварэнняў у дзяржаве. Па-ранейшаму Жыгімонт Аўгуст больш любіў забавы, чым дзяржаўныя справы, мілаваў сваіх каханак, але не рыцарства, захапляўся мастацтвам, а не стваральнай дзейнасцю. Гэта быў аматар мастацтва, эстэт і сібарыт на манаршай пасадзе, а не ўладар па складзе характару і па пакліканні. Ад ваенных паходаў ён ухіляўся, спасылаючыся на кволае здароўе, а па-простаму з-за маладушша і нерашучасці. Ён мусіў падначальвацца абставінам, а не рабіць іх, згаджацца, а не настойваць на сваім, хоць часам і праяўляў упартасць, але не меў цвёрдасці ўладара. І ў складаным становішчы, у цяжкі час выпрабаванняў ён быў абсалютна бездапаможны як капрызнае і распешчанае дзіця. Гэта яскрава праявілася падчас Лівонскай вайны, калі ў 1563 годзе войска маскоўскага цара Івана Грознага захапіла Полацк і працягвала наступ на Вялікае Княства Літоўскае. Жыгімонт Аўгуст як мог спрабаваў наладзіць абарону краіны ад нападніка, закладваў свае ўладанні на вайсковыя патрэбы, склікаў паспалітае рушэнне, але гэта было відавочна недастаткова. У 1567 годзе ён ухіліўся ад начальства над войскам у паходзе на Полацк і распусціў яго. Не на полі бітваў адчуваў сябе мужчынам, а ў будуарах з каханкамі. Прастадушна, як дзіця, апраўдваўся: «Гэтыя сокалы (каханкі.— **Аўт.**) не дазваляюць ні за што ўзяцца, каб і хацеў бы». І зусім ганебна, з пункту гледжання літвінаў, паводзіў сябе іх гаспадар на Люблінскім сойме ў 1569 годзе, цалкам прыняўшы польскі бок. «Што мне параіць рада і каронная рыцарства, так і зраблю. Нічога не пашкадую, не зраблю ніякіх саступак». Пад ціскам палякаў Жыгімонт Аўгуст пагадзіўся на пераход са складу ВКЛ да Польскага Каралеўства Падляшша, Валыні і Кіеўскага ваяводства, здрадзіўшы сваёй прысязе захоўваць у цэласці Вялікае Княства. Аслабленая Літва была пастаўлена на калені перад Польшчай і мусіла заключыць 1 ліпеня 1569 года Люблінскую унію аб стварэнні федэратыўнай дзяржавы Рэчы Паспалітай. Жыгімонт Аўгуст шчыра лічыў, што робіць сваім падданым у Літве дабро, і ўяўляў унію як сваю вялікую справу, вартую славы. Не задумваўся, што па сутнасці пазбавіў літвінаў іх дзяржаўнасці. Зразумела, ён кіраваўся добрымі намерамі, але ж вядома, што добрыя намеры часта не даводзяць да дабра. Пэўна, чуйным сэрцам Жыгімонт Аўгуст адчуваў гэта, таму прароча і папярэджваў на закрыцці сойма: «Старайцеся аб тым, каб у панствах не чулася, як раней, плачу і стогнаў, бо калі ў іх не будзе справядлівасці, яны не толькі доўга не пратрымаюцца, але Бог звергне іх». Гісторыя, як вынікае, пацвердзіла яго прароцтва.



Справа была зроблена, і Жыгімонт Аўгуст цалкам падпаў пад уладу хітрых прыдворных прайдзісветаў, якія патакалі яго слабасцям і вадзілі яго рукой па дзяржаўных дакументах. Суцяшэнне ён знаходзіў у каханні да Барбары Гіжанкі, так падобнай да яго мілай Басі. Яе нават выкралі з манастыра. Гіжанка нарадзіла каралю дачку. Вось такі грахоўны лёс у каханні! Зрэшты знясілены ад жыцця апошні Ягайлавіч памёр 7 ліпеня 1572 года ў замку Кнышын на Падляшшы, пакінуўшы пасля сябе неадназначную славу.

**Вітаўт ЧАРОПКА.**

# Медальны фініш і ўпэўненасць, што ўзнагароды яшчэ будуць!



## У «Раўбічах» завяршыўся адкрыты чэмпіянат Еўропы па біятлоне

**На турніры пад Мінскам сабраліся вядучыя біятланісты еўрапейскага кантынента і не толькі, гэта прадстаўнікі 37 краін, у тым ліку страляючыя лыжнікі з ЗША, Канады, Кітая, Аўстраліі і Казахстана. Усяго — 295 біятланістаў, гэта значыць Беларусь чарговы раз пабіла рэкорд па колькасці ўдзельнікаў. Асвятляць ход турніру ў «Раўбічы» прыехалі дзясяткі замежных журналістаў.**



Па выніках спаборніцтваў былі разыграны восем камплектаў узнагарод. Першае месца ў медальным заліку заняла зборная Швецыі, у яе актыве тры залатыя, дзве сярэбраныя і адна бронзавая ўзнагароды. Не дзіўна, бо гэтая краіна прывезла ў Беларусь свой наймацнейшы склад. Біятланісты Расіі сталі другімі, у іх скарбонцы два «залатыя», два «серабры» і адна «бронза». На трэцім месцы Нарвегія: два залатыя медалі, адзін сярэбраны і два бронзавыя. Беларусь з трыма ўзнагародамі, «серабро» ў пасьюце і «бронза» ў індывідуальнай гонцы Ірыны Крыўко, а таксама трэцяе месца ў змешанай эстафеце, размясцілася на пятай пазіцыі. Напэўна, магло б быць і лепш, але і такі вынік парадаваў балельшчыкаў, якіх у гэтыя дні ў «Раўбічах» было шмат.

Арганізатары пастараліся паклапаціцца аб усіх аспектах чэмпіянату, прадугледзелі камфортныя трыбуны для гледачоў на стадыёне і зручнае размяшчэнне па ходзе трасы, а таксама арганізавалі забаўляльную праграму. У гэтыя дні ў спартыўным комплексе не пераставалі гучаць музыка і апладысменты.

Асабліва панервавацца арганізатарам прыйшлося з-за надвор'я, бо ў першыя дні чэмпіянату ў Беларусі трымалася плюсавая тэмпература. Каб захаваць трасу, спецыялісты ў прамым сэнсе слова працавалі і днём і ноччу. На дапамогу прыходзілі штучны снег, салетра і спецыяльная тэхніка. Але нават гэтыя аспекты не перашкодзілі беларусам атрымаць высокую ацэнку па арганізацыі чэмпіянату ад віцэ-прэзідэнта Міжнароднага саюза біятланістаў Івора Лехотана, які на цырымоніі закрыцця турніру сказаў масу добрых слоў у адрас арганізатараў.

У сваю чаргу **міністр спорту і турызму Сяргей КАВАЛЬЧУК** у чарговы раз адзначыў, наколькі важныя падобныя турніры для Беларусі. «Біятлон — адзін з самых папулярных відаў спорту, у якім ёсць традыцыі, шматразовыя алімпійскія чэмпіёны, але самае галоўнае — ёсць балельшчыкі, якія так шчыльна запаўнялі трыбуны спарткомплексу, — адзначыў ён. — Ацэнка Міжнароднага саюза біятланістаў для нас важная, бо Беларусі трэба будзе прыняць яшчэ этап Кубка свету ў 2022 годзе. На чэмпіянаце Еўропы нам удалося справіцца з умовамі надвор'я, падрыхтаваць і лыжню, і комплекс па самых высокіх стандартах. Адзначу і дасягненні беларускіх біятланістаў. Асабліва мяне парадавала мужчынская каманда, якая ўсё бліжэй падбіраецца да прызавых месцаў. Чакаем ад нашых страляючых лыжнікаў поспехаў ужо ў Эстэрсундзе, дзе ў сакавіку пройдзе чэмпіянат свету».

У завяршэнне чэмпіянату ў «Раўбічах» адбылася цырымонія перадачы сцяга IBU эстонскаму Отэпя, які прыме чэмпіянат Еўропы па біятлоне ў 2020 годзе. Дарэчы, беларуская каманда застаецца ў спарткомплексе, каб падрыхтавацца да чэмпіянату свету, які пройдзе ў Швецыі з 7 па 17 сакавіка.



# НЕ ТОЛЬКІ ЧЭМПІЁНЫ, АЛЕ І НАВАТАРЫ

## Этап Кубка свету і дэбют сінхронных скачкоў — найлепшыя фрыстайлісты свету пабывалі ў Беларусі



**Нават з біятлоннай трасы чэмпіянату Еўропы было відаць, што на трампліне для фрыстайлістаў таксама кіпяць страсці. «Раўбічы» ў гэтыя выхадныя сталі цэнтрам не толькі біятлона.**

Трэці этап Кубка свету па лыжнай акрабатыцы ў Беларусі сабраў сёлета як ніколі шмат элітных спартсменаў, у такім складзе яны не заўсёды прыязджаюць нават на чэмпіянат свету. Больш за 60 атлетаў з 12 краін, з іх самыя моцныя склады заявілі амерыканцы, кітайцы і расіяне. А вось беларусы на дамашнім этапе недалічыліся некалькіх лідараў, з-за праблем са здароўем сезон прапускаюць Ала Цупер, Ганна Гуськова і Станіслаў Гладчанка.

Затое ў «Раўбічах» выступіла чэмпіёнка свету Аляксандра Раманоўская і алімпійскі чэмпіён Антон Кушнір, кампанію ім склала беларуская моладзь. Для жаночай каманды дамашні этап склаўся вельмі няўдала, ніводная беларуска не змагла прабіцца ў фінал, Аляксандра Раманоўская нават упала на прызямленні. Пазней галоўны трэнер беларускай зборнай Мікалай Казека растлумачыць: Саша выступала з высокай тэмпературай, а маладым дзяўчатам проста не хапіла складанасці праграмы, каб пазмагацца за фінал.

А вось у мужчын усё склалася па-іншаму, Антон Кушнір не толькі прабіўся ў фінал, а яшчэ і паказаў там вельмі складаны скачок, што дазволіла яму ўпершыню ў сезоне падняцца на другую прыступку п'едэстала.

«Усе мы знерваваліся з-за Сашы Раманоўскай, таму што яна на добрым хаду і так выдатна скакала размінку, але поспех Антона ўсё кампенсаваў, — аналізуе выступленне сваіх падапечных Мікалай Казека. — Напярэдзе ў Антона этап Кубка свету ў Кітаі, добра было б замацаваць гэты поспех. Увесь сезон Антон быў побач з п'едэсталам, але ўвесь час нешта яму замінала. Ён, вядома, прагнуў гэтага поспеху тут, у першую чаргу, для самасцвярджэння. Антон выдатна разумее, што яны з Буравым (пераможца этапу Кубка свету ў Беларусі) у гэтых спаборніцтвах былі роўныя, і гэта надасць яму сіл».

Упершыню на этапах Кубка свету ў лыжнай акрабатыцы былі прадстаўлены сінхронныя скачкі, ініцыятарамі такога віду спаборніцтваў сталі беларусы. Пазмагацца за гістарычную перамогу і прызавыя, агульны фонд якіх склаў 12 тысяч беларускіх рублёў, вырашылі 15 пар, 10 мужчынскіх і пяць жаночых. Ацэньвалі працу фрыстайлістаў семь суддзяў, трое з якіх сачылі менавіта за сінхроннасцю. Пары складаліся па жаданні, быў нават інтэрнацыянальны дуэт.

Перамогу сярод мужчын атрымаў беларускі тандэм Антона Кушніра і Арцёма Башлакова. У спаборніцтвах сярод жанчын залатых узнагарод удастоіўся дуэт з ЗША Мэдысан Варметэ / Вінтэр Вінецкі, беларускі Сняжана Драбянкова і Яна Ермашэвіч размясціліся на чацвёртым радку выніковага пратакола.

